

УНІКАЛЬНАЕ НАВУКОВАЕ АДКРЫЦЦЁ НА ПАЛЕССІ

4

ЯК З МЕТАЛУРГА ПЕРАЎТВАРЫЦЦА Ў КВЕТКАВОДА

ЧЗ



Выдаецца з 9 жніўня 1917 г.

Родная газета на роднай мове

# ЗВЯЗДА

19 ЛІПЕНЯ 2018 г. ЧАЦВЕР № 136 (28752)

## ЦЫТАТА ДНЯ



**Анатоль ІСАЧАНКА, старшыня Мінскага аблвыканкама:**

*«На кожны прыём людзі ідуць са сваімі зваротамі. Задача ўлады — адсачыць, дзе ёсць сістэмныя праблемы, а ў якім выпадку чалавек ідзе па асабістым пытанні. Трэба аддзяляць іх адзін ад аднаго і зрабіць так, каб усім людзям было добра».*

## КОРАТКА

• У Беларусі за апошнія пяць гадоў у лясах адшуквалі больш за тысячу чалавек.



• **Еўракамісія прадставіла праект кодэкса па барацьбе з фэйкавай інфармацыяй у інтэрнэце. Чакаецца, што ён будзе канчаткова зацверджаны Еўракамісіяй у канцы верасня.**

• У Беларускім дзяржаўным універсітэце на спецыяльнасці «дызайн (кірунак — камунікацыйны)» конкурс склаў 31,5 чалавека на месца.

• **Лідскае ААТ «Завод «Оптык» выпусціла першую партыю аптычных загатовак з германію.**

• Лодка, на борце якой знаходзілася больш за сотню нелегальных мігрантаў з Сірыі, затанула ў Міжземным моры каля ўзбярэжжа Кіпра.

• **Фінскі нападаючы Тэему Пулкінен будзе выступаць у ХК «Дынама-Мінск». Кантракт разлічаны на наступны сезон.**

ISSN 1990 - 763X

# Татава сонейка



Фота Анатоля КЛЕШЧУКА.

Летні надвячорак у наваколлях возера Шо і вёскі Хралы Глыбоцкага раёна. Сюды часта наведваецца Аляксей КОЦ — жыхар Полацка са сваёй пяцігадовай дачкой Мар'янай.

■ «Звязда» даследуе праблему

## ЧЫЯ РАДАСЦЬ ТЫ, ЛЯНОК?

Беларускія навукоўцы расказалі аб асаблівасцях і складанасцях вырошчвання стратэгічнай нацыянальнай культуры

**Унікальным і вядомым на ўвесь свет беларускі лён робяць айчынныя навукоўцы. Менавіта дзякуючы іх намаганням нашы сарты льну-даўгунцу пераўзыходзяць па ўраджайнасці ўсе замежныя аналагі і забяспечваюць яе на ўзроўні больш за 18 ц/га ўмоўнага льновалакна. Замежныя сарты вельмі часта папросту не могуць адаптавацца да пераменлівых умоў беларускага надвор'я, што негатыўна ўплывае на якасць трасты. Пры гэтым беларускія гаспадаркі парадаксальна працягваюць актыўна закупляць і вырошчваць замежныя сарты. Чаму так адбываецца, карэспандэнт газеты «Звязда» даведаўся ў дырэктара Інстытута льну Івана ГОЛУБА. У размове ўсплылі і болевыя кропкі галіны.**

СТАР. 4



Фота Паўла КАЛАБНЁВА.

■ Занятасць

## Канкураваць давядзецца наймальнікам?

### Нізкае беспрацоўе захаваецца як мінімум да кастрычніка

**З пачатку года афіцыйнае беспрацоўе ў краіне не перавышала ўзровень 0,5 працэнта. А ў ліпені ўвогуле знізілася да 0,4. Вакансіі таксама б'юць рэкорды — у базе налічваецца амаль 77 тысяч прапаноў ад наймальнікаў (на 40 працэнтаў больш, чым год таму). Ці надоўга захаваецца гэта тэндэнцыя, якіх спецыялістаў не хапае рынку працы, а дзе сітуацыя з пошукам работы дагэтуль застаецца напружанай?**

### ЧАТЫРЫ ПРАБЛЕМНЫЯ РАЁНЫ

На паляпшэнне стану рынку паўплывала развіццё эканомікі, адзначае **Алег ТОКУН, начальнік упраўлення палітыкі занятасці Міністэрства працы і сацыяльнай абароны.** «Расце ВУП, прадпрыемствы актыўна працуюць, павялічваюць выпуск прадукцыі, таму набіраюць больш людзей. Адбіваецца і работа па стварэнні новых працоўных месцаў. У першым квартале такіх з'явілася 16,3 тысячы — амаль на тысячу лепш, чым прагназавалася».

Тое, што амаль 64 працэнты вакансій — па рабочых прафесіях, у міністэрстве лічаць добрым паказчыкам. «Гэта значыць, што будаўнічая і прамысловая галіны развіваюцца».

На думку спецыяліста, такая сітуацыя захаваецца да кастрычніка. Восенню магчымы невялікі рост зваротаў у службу занятасці. Прычын некалькі. Скончацца сезонныя і сельскагаспадарчыя работы, на біржу выйдуць выпускнікі ўніверсітэтаў і каледжаў, людзі пасля адпачынкаў будуць шукаць новую работу.

СТАР. 2

■ Сацыяльны вектар

# Пенсіі павялічацца са жніўня

**Сярэдняя пенсія па краіне складзе 364,2 беларускага рубля. Як мы ўжо паведамлялі, учора Прэзідэнт Беларусі Аляксандр Лукашэнка падпісаў адпаведны ўказ. Сёння расказваем пра гэта падрабязней.**

Указам Прэзідэнта прадугледжаны пераразлік пенсій з 1 жніўня, у выніку якога працоўныя пенсіі павялічацца ў сярэднім на 10 %. Гэта другое павышэнне пенсій за 2018 год, папярэдні пераразлік працоўных рабіўся ў маі. Тады іх памер вырас у сярэднім на 5,3 %.

Паводле паведамлення БелТА, якое спасылаецца на Міністэрства працы і сацыяльнай абароны, сярэдні памер пенсій са жніўня складзе 364,2 рубля, сярэдні памер пенсіі па ўзросце — 374,33 рубля.

Нагадваем, што пераразлік працоўных пенсій залежыць ад павелічэння сярэдняй зарплаты ў краіне. Адначасова з такім павышэннем падвяргаецца пераразліку і памер даплаты да мінімальных працоўных пенсій, які складае 20 % ад сярэдняй заработнай платы.

А вось самі мінімальныя працоўныя пенсіі, гэтак жа як і сацыяльныя пенсіі, а таксама надбаўкі да пенсій, павышэнні асобным катэгорыям пенсіянераў і даплаты за так званае доўгажыхарства, якія атрымліваюць пенсіянеры ва ўзросце 75 гадоў і старэйшыя, залежаць ад памеру бюджэту пражытковага мінімуму (БПМ) у сярэднім на душу насельніцтва. У сувязі з запланаваным яго змяненнем у жніўні яны таксама будуць пераразлічаны.

У цэлым у кожным канкрэтным выпадку памер павелічэння пенсіі ў выніку пераразлікаў будзе залежаць ад індывідуальных параметраў стажу і велічыні заробку, а таксама налічаных надбавак, павышэнняў і даплат.




# УСЁ ПАЧЫНАЕЦЦА З ДАРОГІ

## Рэканструкцыю ўчастка аўтадарогі Р53 ад Кургана Славы да Смалявіч пачнуць у наступным годзе

— Па тэрыторыі нашай краіны праходзяць два міжнародных калідоры. Летась некалькі аўтадарог былі ўключаныя ў еўрапейскія транспартныя калідоры, што дазваляе прэтэндаваць на еўрапейскую дапамогу ў іх рэканструкцыі, — адзначыў **начальнік галоўнага ўпраўлення аўтамабільных дарог Міністэрства транспарту і камунікацый Аляксандр ГАЛАЎНЁЎ.** — Дарожная інфраструктура развіваецца ў тым ліку ў рамках падрыхтоўкі да II Еўрапейскіх гульняў. Распрацаваны планы з канкрэтнымі аб'ектамі, работамі, фінансаваннем.

У наступным годзе пачнецца рэканструкцыя дарогі Р53. Пачалася таксама распрацоўка абгрунтавання інвестыцый па дарозе М3 Мінск — Віцебск на ўчастку ад Лагойска да Лепеля. Прадстаўнік Мінтранса таксама дадаў, што ў ліпені завершана рэканструкцыя дарогі ў аб'езд Слуцка па параметрах першай катэгорыі. У завяршальнай стадыі знаходзяцца работы па рэканструкцыі дарогі Мінск — Гродна.

Мінтранс вялікую ўвагу ўдзяляе таксама развіццю прыдарожнага сэрвісу. «Гэта немалаважны фактар для бяспекі руху, чалавек, які адпачыў, больш прадказальна паводзіць сябе на дарозе. Ліччу, сёння прыняты ўсе неабходныя нарматыўна-прававыя акты, якія рэгулююць асаблівасці размяшчэння і функцыянавання аб'ектаў, наладжаны кантроль з боку дзяржорганаў і арганізацый за бяспекай эксплуатацыі аб'ектаў», — удакладніў Аляксандр Галаўнёў.

А вось крэдытнае пагадненне з Еўрапейскім інвестыцыйным банкам (ЕІБ) па праекце рэканструкцыі аўтадарогі М7 Мінск — мяжа Літвы плануецца падпісаць у найбліжэйшы час. Аляксандр Галаўнёў лічыць, што пакуль канчатковае рашэнне не прынята, але дасягнута дамоўленасць з інвестыцыйным банкам, ёсць рашэнне Савета дырэктараў аб уключэнні гэтага аб'екта ў партфель крэдытавання.

«Згаданае пытанне будзе вырашана на працягу гэтага месяца, і мы выйдзем на падпісанне пагаднення з банкам», — лічыць прадстаўнік міністэрства.

**Сяргей КУРКАЧ.**

# Канкурыраваць давядзецца наймальнікам?

*(Заканчэнне. Пачатак на 1-й стар.)*

— У нас многія прывыклі пачынаць жыццё з 1 верасня, — усміхаецца Алег Токун. — Але пры тым попыце на рабочую сілу, які ёсць, вялікага скачка паказчыка беспрацоўя не будзе.

Праўда, не ва ўсіх рэгіёнах становішча спрыяльнае. На пачатку года па краіне было выдзелена 48 тэрыторый з напружанай сітуацыяй на рынку працы. Іх маніторынг вёўся штомесячна. У выніку ў 30 раёнах паказчыкі палепшыліся. На гэта паўплывалі і актыўная работа службаў занятасці, і дзеянні мясцовых органаў улады па садзейнічанні малому бізнесу, стварэнні новых месцаў. У 14 раёнах сітуацыя не змянілася. А вось у чатырох — Сенненскім, Чашніцкім, Бярэзінскім і Слаўгарадскім — наогул пагоршылася.

### РАБОЧЫМ — У РАСІЮ І ПОЛЬШЧУ

Іншая тэндэнцыя, якая назіраецца на рынку працы, — гэта рост колькасці работнікаў, што з'язджаюць за мяжу. Калі за студзень — чэрвень мінулага года працаваць у іншыя краіны, па звестках МУС, адправілася пяць тысяч беларусаў, то за першае паўгоддзе 2018-га — 5,8 тысячы. Кожны трэці з іх — мінчанін. А радзей за ўсё з'язджаюць з Мінскай вобласці.

Неафіцыйныя лічбы, зразумела, большыя: многія ездзяць на работу па турыстычнай візе або ў суседнюю Расію, дзе віза непатрэбна. Ці можна лічыць павелічэнне адтоку кадраў адной з прычын зніжэння беспрацоўя на ўнутраным рынку? У профільным міністэрстве мяркуюць, што не: не тыя маштабы.

Самай папулярнай «працоўнай» краінай застаецца Расія: туды з пачатку года адправілася 2,7 тысячы чалавек. На другім месцы Польшча, дзе знайшлі сабе работу 1,6 тысячы наших суайчыннікаў. Літву выбралі 695 чалавек, ЗША — 274, Германію — 208, Чэхію — 164. Практычна 68 працэнтаў працоўных мігрантаў з Беларусі — мужчыны.

Пераважная колькасць (81 %) тых, хто з'язджае на работу за мяжу, уладкоўваюцца рабочымі. 12 % працуюць у сферы абслугоўвання і гандлю, 6 % — у сельскай гаспадарцы. Толькі 0,5 % былі запрошаны ў якасці кваліфікаваных спецыялістаў, а кіраўнікамі і таго менш — 0,1 %.

### 57 ВАКАНСІЙ І НУЛЬ ПРЭТЭНДЭНТАЎ

Вернемся да беларускіх рэалій. Традыцыйна самымі запатрабаванымі сярод спецыялістаў застаюцца медыцынскія сёстры (на 2,6 тысячы вакансій толькі 27 прэтэндэнтаў) і ўрачы (2,4 тысячы месцаў і 16 беспрацоўных з адпаведнай адукацыяй). Амаль 1,2 тысячы прапаноў для ветэрынараў. У топе таксама інжынеры (927 вакансій), бухгалтары (836), фельчары і фельчары-лабаранты (705). Запатрабаваны менеджары і фармацэўты.

Што датычыцца рабочых прафесій, то больш за ўсё вакансій адкрыта для кіроўцаў — 3,1 тысячы (саіскальнікаў, якія б хацелі праводзіць працоўны дзень за рулём, у шэсць разоў менш). Патрабуюцца таксама трактарысты (для іх — 2,1 тысячы прапаноў па краіне), прадаўцы і швачкі (па 1,9 тысячы), муляры (1,5 тысячы). Адчуваецца недахоп кухараў, тынкоўшчыкаў, маляроў, электрагазазваршчыкаў і электраманцёраў.

Калі глядзець на сітуацыю асобна ў гарадах, то ў пяцёрцы самых запатрабаваных прафесій — медыцынскія сёстры, урачы, кіроўцы, швачкі і прадаўцы. Топ для сельскай мясцовасці складаюць трактарысты, аператары машыннага даення, ветэрынары, кіроўцы і жывёлаводы.

На некаторыя вакансіі канкурэнцыя адсутнічае наогул. Так, на 210 прапаноў для фармацэўтаў у гарадах прэтэндуе ўсяго адзін беспрацоўны спецыяліст. На вёсцы не хапае 92 педагогаў-псіхолагаў (і толькі адзін адпаведны саіскальнік) і 57 кіраўнікоў фізічнага выхавання, на месца якіх не зарэгістравана ахвотных ці падыходзячых кандыдатаў.

### ШТО З ЗАРОБКАМІ?

Бадай, галоўнае пытанне. Менш за 400 рублёў у месяц прапануюць 38 % вакансій. Ад 400 да 599 рублёў гатовы плаціць на 35 % свабодных месцаў, ад 600 да 799 — 16 %. Заробак у 800—999 рублёў утрымліваюць 6 % вакансій, а больш за тысячу абяцаюць усяго ў 5 % выпадкаў. Самыя грашовыя працоўныя месцы (з аплатай у пяць тысяч рублёў і больш) — для дырэктараў.

— На жаль, заробкі застаюцца на тым жа ўзроўні, — канстатуе Алег Токун. — Хоць, калі захаваецца бягучая тэндэнцыя (маю на ўвазе рост попыту на кадры), наймальнікам давядзецца перагледзець заробкавую палітыку і зрабіць свае вакансіі больш прыцягальнымі.

**Наталля ЛУБНЕЎСКАЯ.**

# ШТО Ў СВЕЦЕ РОБІЦЦА

### ДЗЯРЖДЭПАРТАМЕНТ: ЗША І РАСІЯ СКАРАЧАЮЦЬ СВАЕ ЯДЗЕРНЫЯ АРСЕНАЛЫ

Разгорнутых і неразгорнутых пускавых установак міжкантынентальных балістычных ракет і балістычных ракет на падлодках, а таксама цяжкіх бамбардзіроўшчыкаў у Расіі налічваецца 779, у ЗША — 800.

ЗША і Расія выконваюць свае абавязацельствы па Дагаворы аб мерах па далейшым скарачэнні і абмежаванні стратэгічных наступальных узбраенняў (ДСНУ).

Гэта пацвердзіў Дзяржпдэпартамент, апублікаваўшы даведку аб скарачэнні дзвюма краінамі сваіх ядзерных арсеналаў у адпаведнасці з пагадненнем ад 5 лютага 2011 года.

Прэзідэнт Дональд Трамп заявіў у інтэрв'ю тэлеканалу Fox News пасля сустрэчы з прэзідэнтам Уладзімірам Пуціным у Хельсінкі, што Вашынгтон і Масква толькі пачынаюць абмеркаванне пытанняў ядзернага нераспаўсюджвання, у тым ліку і дагавора, якія датычацца скарачэння СНУ і ліквідацыі ракет сярэдняй і меншай далёкасці.

Як паведаміў таксама ў інтэрв'ю Fox News Пуцін, Расія гатовая падоўжыць ДСНУ.

### МЭЙ ПРЫГРАЗІЛА НЯЗГОДНЫМ З ЯЕ ПЛАНАМ ПА БРЭКСІЦЕ ДАТЭРМІНОВЫМІ ВЫБАРАМІ

Прэм'ер-міністр Вялікабрытаніі Тэрэза Мэй прыгразіла нязгодным у кіруючай кансерватыўнай партыі з яе планам развіцця эканамічных сувязяў паміж Лонданам і Бруселем пасля брэксіту датэрміновымі парламенцкімі выбарамі. Пра гэта паведаміла ў сераду газета The Times.



Паводле яе даных, з падобным папярэджаннем Мэй выступіла непасрэдна перад вырашальным галасаваннем у аўторак вечарам у Палаце абшчын брытанскага парламента па папраўцы да гандлёвага біля, якую прапанавалі крытыкі прэм'ера на чале са Стывенам Хамандам і Нікі Морган. У выніку гэтага рашучага кроку дэпутаты ніжняй палаты невялікай большасцю галасоў адхілілі папраўку. Супраць унясення адпаведнай заканадаўчай змены выступілі 307 дэпутатаў, за — 301.

Брэксіт пройдзе 29 сакавіка 2019 года, пасля чаго, згодна з планам, павінен наступіць пераходны перыяд, які будзе доўжыцца да 31 снежня 2020 года.

### ПАРЛАМЕНТ ІЗРАІЛЯ ПАЗБАВІЎ ПРЭМ'ЕРА І МІНІСТРА АБАРОНЫ ПАЎНАМОЦТВАЎ АБ'ЯЎЛЯЦЬ ВАЙНУ

Кнэсет (парламент) Ізраіля адмяніў прынятую ў красавіку папраўку да Асноўнага закона аб урадзе, якая дазваляла прэм'ер-міністру і міністру абароны прымаць у экстранных выпадках рашэнне аб аб'яўленні вайны без узгаднення з ваенна-палітычным кабінетам і парламентам.

«Кнэсет на пленарным пасяджэнні адмяніў папраўку, якая дазваляла прэм'ер-міністру і міністру абароны аб'яўляць вайну», — гаворыцца ў камюніке парламенцкай прэс-службы. Цяпер аб'яўленне вайны або пачатак маштабнай ваеннай аперацыі павінны зацвярджацца толькі ваенна-палітычным кабінетам, у які ўваходзяць ключавыя міністры ўрада яўрэйскай дзяржавы.

### СМІ: БАЦЬКІ ЗМОГУЦЬ ВЫБІРАЦЬ ЗНЕШНАСЦЬ БУДУЧЫХ ДЗЯЦЕЙ

Брытанскія бацькі змогуць выбіраць жаданыя рысы сваіх будучых дзяцей — такія як рост, колер валасоў і вачэй і іншае. Як паведамляе газета The Independent, гэта стала магчымым дзякуючы тэхналогіі рэдагавання генаў, якая дазваляе ўнесці змены ў малекулу ДНК чалавечага эмбрыёна.

Раней генетычная мадыфікацыя ДНК эмбрыёна чалавека ў Злучаным Каралеўстве лічылася «маральна непрымальнай».

«Мы занадта шмат думалі пра гэта і прыйшлі да высновы, што само па сабе ўмяшанне ў спадчынны геном не з'яўляецца маральна непрымальным», — перакананы прафесар Нуфілдскага савета па біяэтыцы Карэн Юнг. На яго думку, унясенне змяненняў у малекулу ДНК чалавека магчымае толькі пры выкананні двух умоў. Па-першае, такая працэдура павінна прывесці да ліквідацыі сур'ёзных хвароб і паляпшэння фізічных уласцівасцяў арганізма. Па-другое, яна не павінна спрыяць росту дыскрымінацыі і падзелу грамадства.

■ На слыху

## «АЛМАЗ» ВЫЗВАЛІЎ ЗАЛОЖНІЦУ Ў АДДЗЯЛЕННІ БАНКА Ў ЗАСЛАЎІ

**Пра гэта журналістам паведаміў міністр унутраных спраў Беларусі Ігар ШУНЕВІЧ. Мужчына, які захапіў заложніцу, ліквідаваны.**



Фота БелТА.

«У аддзяленні Белінвестбанка ў горадзе Заслаўі злачынец, узброены нажом, захапіў у заложнікі дзяўчыну. Больш за дзве гадзіны мы вялі з ім перамовы. Ён паводзіў сябе неадэкватна, адмаўляўся скласці зброю і адпусціць заложніцу, пагражаў. Асоба злачынца намі ўстаноўлена — гэта раней двойчы судзімы за ўчыненне цяжкіх і асабліва цяжкіх злачынстваў жыхар Заслаўя, — паведаміў міністр. — Пасля беспаспяховых перамоў і вычарпання ўсіх магчымасцяў мірна вырашыць гэтую справу было прынята рашэнне аб правядзенні сілавой аперацыі, а менавіта аб вызваленні заложніцы. Яна была паспяхова праведзена сіламі спецпадраздзялення МУС «Алмаз». Заложніца была вызвалена. Дзяўчына не пацярпела. Па папярэдніх даных, яна цяжарная. Гэта мела пэўныя абставіны з пункту гледжання сілавой аперацыі. Злачынец ліквідаваны».

Міністр адзначыў, што матывы злачынцы будзе высвятляць следства. «Яшчэ раз падкрэсліваю, мы вялі перамовы больш за дзве гадзіны, супрацоўнікі, якія вялі перамовы, будуць следствам дапытаныя, яны ўсё падрабязна выкладуць. Ёсць відэазапіс усяго працэсу, таму дадатковыя абставіны, якія звязаны з гэтым злачынствам, можна будзе даведацца ў органаў папярэдняга следства», — сказаў міністр. Па словах Ігара Шуневіча, злачынец выстаўляў розныя патрабаванні.

Як паведаміла афіцыйны прадстаўнік Следчага камітэта Юлія Ганчарова, СК узбудзіў крымінальную справу па факце захопу заложнікаў. Цяпер следчая група пад кіраўніцтвам начальніка УСК па Мінскай вобласці прыступіла да агляду месца здарэння. Па папярэдніх даных, дзяўчына 1995 года нараджэння была захоплена мужчынам. Абодва яны не маюць дачынення да банка і прыйшлі туды ў якасці наведвальнікаў.

## НЕ ВЫТРЫМАЛА СЕТКА

**У аўторак ва Уздзенскую цэнтральную раённую бальніцу паступілі два хлопчыкі ва ўзросце пяці і шасці гадоў і двухгадовая дзяўчынка. У малых урачы дыягнаставалі сур'ёзныя пашкоджанні — траўмы галавы, пераломы сцягна, пляча, не кажучы ўжо пра звычайныя ўдары.**

Аказалася, што дзеці ўпалі з вышыні, большай за пяць з паловай метраў. Хлопчыкі і дзяўчынка гулялі на другім паверсе прыватнага дома. У пакоі дарослых не было. Дзеці падцягнулі крэсла да акна і забраліся на падаконнік. Затым расчынілі акно і абаперліся на маскітную сетку. Яна сарвалася з мацаванняў, а ўслед за ёй паляцелі і малыя...

— Папярэдне вядома, што сем'і, дзе жывуць дзеці, характарызуюцца станоўча, на ўліку яны не стаяць, — расказала афіцыйны прадстаўнік упраўлення Следчага камітэта па Мінскай вобласці Таццяна Беланог.

Следчыя заклікаюць не пакідаць дзяцей без нагляду і максімальна выключыць магчымасць таго, каб малыя самі адчынялі вокны.

**Валяр'ян ШКЛЕННІК**

■

# НЕСМЯРОТНАЕ «ДЗІКАЕ ПАЛЯВАННЕ»...

### Рэйтынгі ад «Белкнігі»: творы на беларускай мове

**У краіне працуе больш за 100 кнігарняў у сістэме дзяржаўнага кнігагандлю — крамы «Белкнігі». Па кварталах і паўгоддзях распаўсюджвальнікі кніжнай прадукцыі вядуць рэйтынгі продажу: літаратуры замежнай і беларускай вытворчасці; літаратуры вытворчасці Рэспублікі Беларусь, якая прадаецца ў «Белкнізе»; літаратуры на беларускай мове.**

Хто ж, якія аўтары, якія кнігі сярод лідараў у першым паўгоддзі? Размова — пра рэйтынг кніг, што выйшлі пабеларуску.

Сярод такіх выданняў больш за ўсё асобнікаў прададзена «Дзіцячага атласа Беларусі» — 435 экзэмпляраў. Кніга выйшла ў выдавецтве «Мастацкая літаратура». Другое месца — у кнігі «Беларускія казкі» (выдавецтва «Парадокс»). Прададзена 190 экзэмпляраў. Следам ідзе Уладзімір Караткевіч з «Дзікім паляваннем караля Стаха». Класіка неўміручая! Дарэчы, з класічных твораў у чытача карыстаюцца попытам кнігі Якуба Коласа «Новая зямля», «Сонцавы косы», Уладзіміра Караткевіча «Каласы пад сярпом тваім», «Чорны замак Альшанскі», «Хрыстос прызямліўся ў Гародні», Міхася Лынькова «Міколка-паравоз», Андрэя Мрыя «Запіскі Самсона Самасуя». Згаданыя выданні ўвайшлі ў лік 45 кніг, якія прыцягнулі найбольшую ўвагу. Праўда, «Новую зямлю» набылі 129 чытачоў, а раман А. Мрыя — усяго толькі 15.

З сучасных аўтараў у ліку 45 кніг, якія лідзіруюць у рэйтынгу «Белкнігі», — Мікола Маляўка, Мікола Бусько, Генадзь Аўласенка, Алесь Лозка, Таццяна Дамаронак, Алена Масла, Сяргей Давідовіч, Сяргей Тарасаў. З твораў пісьменнікаў, якія нядаўна пайшлі з жыцця, цікавасць чытача, пакупніка выклікаюць кнігі Паўла Місько і Янкі Галубовіча. Ёсць і перакладныя кнігі — «Возера радасці» Віктара Марціновіча, «Мемуары Мумітаты» Тувэ Янсан, «Эла і сябры» Цімы Парвелы.

**Сяргей ШЫЧКО.**

■ Стыхія

# Атмасферны фронт не адступае

### Не першыя суткі сталіцу і іншыя населеныя пункты краіны правярае на трываласць непагадзь

Што да Мінска, то ліўні не першы год для жыхароў ператвараюцца ў сапраўднае выпрабаванне. Зараз, напрыклад, падтапленні сталі галаўным болем для ўладальнікаў кафэ і офісаў на першых паверхах будынкаў нядаўна рэканструяванай вуліцы Рэвалюцыйнай. Пасля першага патопу ваду з памяшканняў выграбалі вёдрамі і анучамі, а кліенты вымушаны былі пакідаць гэтыя ўстановы праз вокны. На наступны дзень тут падрыхтаваліся адмысловым спосабам: уваходы былі закладзены мяшкамі з пяском, якія мусяць крыху спыняць патокі вады. Паводле слоў гаспадароў, дзякуючы такім барыкадам вады гэтым разам у памяшканнях было меней.




Фота БелТА.

На яшчэ адной з цэнтральных сталічных вуліц — Кірава — другі дзень запар ваду адкачвае МНС разам з валанцёрамі Чырвонага Крыжа. Сведкай гэтага «пашчасціла» стаць асабіста. Сесці ў разгул непагадзі за руль прымусілі абставіны: дачка апынулася ў цэнтры горада без парасона. Паездка на аўтамабілі ў такі час — тое яшчэ выпрабаванне на пільнасць і ўважлівасць. За шчыльным патокам вады, з якім не паспяваюць спраўляцца шчоткі, не відаць не тое што дарожнай разметкі — нічога не відаць. Бакавым зрокам заўважаю, што машына з суседняга рада рэзка перастройваецца ў мой, і хуценька тармажу. Збіраюся пасігналіць нахабнаму кіроўцу, але бачу, што ў яго паласе ляжыць матацыкл, стаіць мінівэн, аб які апошні ўдарыўся, і вельмі спадзяюся, што тут усё абышлося без ахвяр...

Першая водная перашкода (калі не лічыць, што ўся праезная частка — вялікі паток) сустракае перад пад'ёмам на мост на вуліцы Кальварыйскай. У нізіне сабралася невялікае возера. Хтосьці імкнецца перастроіцца ў крайнюю левую паласу, дзе вады меней, хтосьці проста павольна праязджае. Але нават і думкі не ўзнікае, што наперадзе можа чакаць сапраўды непераадольная перашкода. Без праблем праязджаю скрыжаванне з вуліцай Нямігай, яе пасля будаўніцтва калектара, здаецца, больш не падтапляе, гэтак жа прамінаю частку праспекта Незалежнасці. Як ні дзіўна, на галоўным праспекце сталіцы, нягледзячы на стыхію, затораў няма. І выязджаю на вуліцу Кірава. У нізіне за стадыёнам «Дынама» на праезнай частцы разлілося возера. Пасярэдзіне стаіць заглухлы аўтамабіль, дзяўчына-кіроўца выбралася на сушу і з надзеяй паглядае ў бок аўтамабіля МНС, які з мігалкамі спяшаецца на дапамогу. Па краях таксама затопленыя ледзь не па самыя вокны прыпаркаваныя раней аўтамабілі — калі б ведалі кіроўцы, чым скончыцца гэта часовая стаянка, відавочна, пакінулі б свае машыны ў больш надзейным месцы. Карціна вельмі працвярэжвае: больш ніхто штурмаваць водную перашкоду не адважваецца, усе разварочваюцца і мяняюць маршрут. Мне ж увогуле хацелася паставіць аўтамабіль у надзейным месцы і больш не выпрабоўваць яго на трываласць...

МНС сапраўды ў гэтыя суткі працуе ў напружаным рэжыме. Толькі ў сталіцы ў розных раёнах ветрам паваленa больш за дзясятак дрэваў. На вуліцы Якуба Коласа паваліўся рэкламны шчыт, а на Кальварыйскай упаў гандлёвы павільён, прычым тут без пацярпелых не абышлося: двое 20-гадовых студэнтаў — хлопец і дзяўчына — дастаўлены ў бальніцу з ранамі галавы.

Былі ў ратавальнікаў і нестандартныя выклікі: у Рагачоўскім раёне падчас разгулу стыхіі ветрам знесла частку буслінага гнязда. Трое буслянят апынуліся на зямлі, пра што паведамілі відавочцы. Ратавальнікі знайшлі птушанят і з дапамогай лесвіцы вярнулі іх «дадому».

На Гродзеншчыне ў вёсцы Падліпяны Астравецкага раёна маланка трапіла ў гаспадарчую пабудову, якая загарэлася. Гэтак жа загарэўся і драўляны дом у Івацэвічах, у здарэннях, на шчасце, ніхто не пацярпеў.

На сёння, 19 ліпеня, сіноптыкі зноў аб'яўляюць аранжавы ўзровень небяспекі: на большай частцы краіны чакаюцца моцныя ліўні, град, шквалісты вецер. Прырода працягвае выпрабоўваць. Каго — на трываласць, некага — на цярпенне...

**Алена КРАВЕЦ**

■

■ Запрашальнік

# Спыніцца... Усміхнуцца

**«Беларусы. Арт-пазітыў». Пад гэтай назвай у мінскім Доме кіно адкрылася выстаўка вядомага творцы, члена Саюза мастакоў Беларусі Алега КАРПОВІЧА. На ёй прадстаўлена каля 30 графічных работ, здольных прымусіць гледача найперш... усміхнуцца, а потым, магчыма, неяк па-іншаму паглядзець на... сябе і свет.**



Працуючы аглядальнікам і мастаком у штодзённай газеце «СБ. Беларусь сегодня», Алег Карповіч стварыў дзясяткі тысяч малюнкаў, якія друкаваліся ў тым ліку ў часопісе «Вожык». Сярод іх — карыкатуры, сяброўскія шаржы, плакаты, стылізаваныя партрэты вядомых палітычных і грамадскіх дзеячаў, пісьменнікаў, артыстаў. У апошнія гады — і выстаўка таму ў пацвярджэнне — мастак вылучыў для сябе дзве найважнейшыя тэмы: «Беларусы» і «Мір».

— Адзін малюнак — гэта адзін гук, адно слова, — зазначыў Алег Карповіч, — два-тры малюнкі — выяўленчы акорд, чатыры-пяць — ужо мелодыя, а выстаўка — гэта, калі не сімфонія, то, магчыма, песня. І тут, мне здаецца, нават канкрэтная: «Мы, беларусы, мірныя людзі»...

Цёплыя словы ў адрас мастака на адкрыцці выстаўкі прамовілі старшыня Беларускага саюза мастакоў Рыгор Сітніца, галоўны рэдактар газеты «СБ. Беларусь сегодня» Дзмітрый Жук, мастацкі рэдактар часопіса «Вожык» Аляксандр Каршакевіч, мастак Алег Папоў ды іншыя.

Выстаўка будзе працаваць да 28 жніўня, потым пазнаёміцца з ёй змогуць гаспадары і госці Дня беларускага пісьменства, які сёлета пройдзе ў Іванаве, жыхары іншых райцэнтраў, бо і арт, і тым больш пазітыў патрэбныя сёння ўсюды.

**Валянціна ДОЎНАР**

■

# ЧЫЯ РАДАСЦЬ ТЫ, ЛЯНОК?

## Устойлівыя сарты

Дзякуючы Інстытуту льну, што знаходзіцца ў мястэчку Вусце ў Аршанскім раёне, Віцебскай вобласці, беларускія сарты працягваюць развівацца і паказваць ураджайныя вынікі. Сёння дасягненні ў селекцыі робяць нашу краіну адным з найбуйнейшых вытворцаў ільняной трасты. Паводле слоў Івана Голуба, з адкрыццём інстытута сярэдняя ўраджайнасць ільну ў Беларусі павялічылася ў 2,5 раза, да 10 ц/га.

Сёння інстытут з'яўляецца самай буйной арганізацыяй, якая займаецца льном не толькі ў навуковым, але і ў вытворчым плане. У яго распараджэнні знаходзіцца больш за 300 га плошчаў, на якіх вырошчваецца лён-даўгунец. Акрамя таго, тут займаюцца вывядзеннем новых сартоў, насенняводствам. Сёння ў інстытуце вырошчваюць сем новых сартоў: «Ласка», «Грант», «Лада», «Веста», «Рубін», «Дукат», «Мара», «Маяк» — раннія, сярэднія і пазнейшыя — для патрэб кожнай вобласці.

На плошчах арганізацыі летась удалося атрымаць больш за 1,65 тысячы тон трасты (54 ц/га). Такая ўраджайнасць айчынных сартоў цікавіць расійскіх вытворцаў ільну, якія гатовыя закупляць яго ў вялікай колькасці.

«Нам незразумелая сітуацыя, што беларускія гаспадаркі закупляюць замежныя сарты, калі яны не паказваюць найлепшы вынік. Акрамя таго, нашы сарты таннейшыя. Так, цана першай рэпрадукцыі насення французскай селекцыі — 3 еўра за кілаграм. Наша насенне ў тры разы таннейшае. Засеяць гектар французскім ільном абыдзецца ў 375 еўра, нашым — каля 120 еўра», — Іван Голуб не хавае свайго здзіўлення. Тым больш пра лепшую якасць замежнага льну гаварыць не даводзіцца: паводле слоў навукоўца, яшчэ ні адзін замежны сорт не змог пераўзысці цалкам нашы айчынныя, дзе б яны ні выпрабоўваліся.

«Напрыклад, у выпрабаваннях на Дубровенскім ільнозаводзе, што на Віцебшчыне, мы пераўзышлі французскую тэхналогію і іх сорт у 2010 годзе. Літаральна два гады таму мы праводзілі падобныя выпрабаванні на Пружанскім ільнозаводзе, што знаходзіцца ў Брэсцкай вобласці. Там наш лён сорту «Грант» ні ў чым не саступіў замежным аналагам, а па ўраджайнасці нават пераўзышоў іх», — расказаў Іван Голуб.

Беларускія сарты больш адаптаваныя да мясцовых умоў і лепш вытрымліваюць любыя мясцовыя кліматычныя змены. Пры гэтым у інстытуце іх пастаянна ўдасканальваюць, каб насенне было ўстойлівым да шкоднікаў і неспрыяльнага клімату, і развіваюць новыя.

«Пры належнай агратэхніцы нашы сарты здольныя нават у не самых лепшых кліматычных умовах забяспечваць не менш за 5 тон трасты з гектара. Калі б па краіне такую ўраджайнасць мелі ўсе гаспадаркі, то ў нас не было б ніякіх праблем з забеспячэннем ільноваламном», — дадаў вучоны.

## Валакно і экспарт

Сёння магутнасці беларускіх ільнозаводаў дазваляюць перапрацоўваць каля 180 тысяч тон трасты. Аднак **вядучы навуковы супрацоўнік Інстытута льну Валерый КАЖАНОЎСКІ** адзначае, што, на жаль, такі аб'ём сыравіны на іх не пастаўляецца. Патрэбную колькасць ільну проста не сеюць: засяваецца толькі 47 тысяч гектараў, а трэба — 56 тысяч га...

«Атрымліваецца, што нават у самыя лепшыя гады ў краіне збіраюць 140, максімум — 150 тысяч тон трасты. Пры гэтым на выхадзе вельмі мала доўгага валакна. А праблема ў тым, што лён убіраюць не ў час і першапачаткова размяшчаюць не на тых глебах, на якіх трэба», — дадае вучоны.

Ільняное валакно лічыцца доўгім, калі даўжыня сцябліны складае не менш за 85 см. З такога валакна атрымліваецца якасная льняная тканіна, якая цэніцца ў свеце і адпраўляецца на экспарт.

Паводле яго слоў, прыкладна 50 % нарыхтаванай трасты ў мінулым годзе ўбіралася пасля 14 верасня. «Каб своечасова збіраць трасту, павінна быць дастатковая колькасць спраўнай тэхнікі. Таксама патрэбныя сёння і падрыхтаваныя кадры: для работы на ўборачнай тэхніцы патрэбныя кваліфікаваныя механізатары, якіх не хапае. Сёння мы многае губляем пры ўборцы», — дадаў кіраўнік інстытута.

У Інстытуце льну правялі разлікі, згодна з якімі, каб вырошчваць 180 тысяч тон трасты і атрымліваць 55 тысяч тон валакна, трэба давесці пасяўныя плошчы да 56 тысяч га. На 1000 га пасяўных плошчаў трэба тры спраўныя самаходныя церабілкі, каля шасці прычапных ільнокамбайнаў. Заводы тады стабільна закрыюць свае патрэбы і адпадзе неабходнасць у імпарце.




Фота Паўла КАЛАБНЕВА.

«У краіне выпрацоўваецца каля 40 тысяч тон валакна. Больш за палову ідзе на экспарт. Праблема ў тым, што пастаўляць у нас атрымліваецца пераважна кароткае валакно. Асноўным спажыўцом з'яўляецца Кітай, які сёння будзе закупляць столькі, колькі мы прапануем. У іх насельніцтва пастаянна расце, павялічваецца попыт на збожжавыя культуры і даводзіцца скарачаць пасяўныя плошчы пад лён», — расказвае Іван Голуб.

Канешне, тканіна з беларускага льну — наш своеасаблівы брэнд, яна будзе запатрабаваная як экспартны тавар не толькі ў Кітаі. Пры ўмове, што будзем працаваць над паляпшэннем якасці валакна, гаворыць вучоны.

## Губляем пры ўборцы

Адзін з фактараў, які ўплывае на якасць валакна, наяўнасць у парку сучасных машын.

«Таго, што ў нас у распараджэнні нам амаль хапае. Аднак хацелася б больш сучасную тэхніку. Сёння падрыхтоўка насення ў нас ідзе старымі машынамі 70-х гадоў. Мы нават жартуем, што 27 гадоў ужо няма ГДР, а мы ўсё працуем на машынах, якія адтуль прывезлі. Таксама, нам сёння добра мець самаходную льноцерабілку. А пакуль спраўляемся з тым што ёсць», — гаворыць дырэктар інстытута.

На якасць валакна ўплывае і тое, калі ўбіраюць лён. Вучоны адзначыў, што ў краіне далёка не ўсе гаспадаркі прытрымліваюцца аптымальных тэрмінаў уборкі.

«Як правіла, у нашых умовах лён трэба нарыхтоўваць да 15 верасня. Аднак нават летась некаторыя прадпрыемствы ўбіралі яго толькі ў лістападзе. А гэта вельмі негатыўна ўплывае на валакно», — адзначыў Іван Голуб.

## Грашовае пытанне

Адна з важных праблем, якая затармажвае паўнавартаснае развіццё льнаводства, — неплацяжы з боку льнозаводаў. Некаторыя з іх не плацяць вытворцам трасты каля пяці гадоў.

«Сёння прыходзіцца чакаць грашовых разлікаў гадамі. А гэта пагаршае становішча спраў у галіне. Калі мы пачыналі, у 2001 годзе было 1250 гаспадарак, якія сеялі лён. Сёння іх крыху больш за 50. Многія з іх больш за 100 га льну сёння ўжо не сеюць. З-за праблем з узаемнымі разлікамі гаспадарак, якія займаюцца льном, можа яшчэ паменшаць», — расказаў навуковец.

Іван Голуб пры гэтым адзначыў, што праблем па разліках у селекцыйнай часткі няма. Дзяржава своечасова выплачвае грошы за стварэнне навуковых праектаў. Укараненне навуковых распрацовак застаецца прыярытэтным кірункам работы.

«Чатыры гады таму мы стварылі сорт «Грант», і сёння ў краіне ён займае больш за 10 тысяч га. Нам даецца два гады на стварэнне гатунку. У нас ёсць шматгадовыя напрацоўкі, і мы ўкладваемся ў гэты тэрмін», — растлумачыў кіраўнік інстытута.

На думку навукоўцаў, ільнаводства ў краіне будзе працягваць развівацца на высокім узроўні. Будуць ствараецца новыя сарты, укараняцца новыя тэхналогіі. Аднак у сферы па-ранейшаму застаюцца болевыя кропкі, з-за якіх губляюцца якасць і ўраджайнасць ільнопрадукцыі. І гэтыя кропкі трэба вылечваць, каб праца і намаганні былі недарэмнымі.

Ілья КРЫЖЭВІЧ.

(Заканчэнне. Пачатак на 1-й стар.)

■ Чулі?

# Беларускае Палессе стала «калыскай» для славян

## Археолагі знайшлі новыя доказы гэтай гіпотэзы

**Навукоўцы гістарычнага факультэта Беларускага дзяржаўнага ўніверсітэта адкрылі паселішча старажытных славян канца II — першай паловы V стагоддзя нашай эры, пацвердзіўшы гіпотэзу іх паходжання з тэрыторыі Беларускага Палесся.**

Унікальнае навуковае адкрыццё стала магчымае дзякуючы новым археалагічным знаходкам супрацоўнікаў і студэнтаў гістарычнага факультэта каля вёскі Яскавічы Салігорскага раёна Мінскай вобласці.

На гэты час на паселішчы адкрыты шэраг пабудоў і аб'ектаў, датаваных канцом II — першай паловай V стагоддзя нашай эры. Каштоўнасць даследаванняў заключаецца ў тым, што вывучэнне артэфактаў дазволіла адкрыць невядомыя старонкі этнагенезу славян. Да цяперашняга часу не ўстаноўлена і не вызначана тэрыторыя паходжання найбольш ранніх гістарычных славян. Агульнапрызнанай найбольш ранняй археалагічнай культурай славян з'яўляецца пражская, якая належыць нашым продкам V—VII стагоддзяў. Раннія яе помнікі былі адкрыты на тэрыторыі Беларускага Палесся і Кіеўшчыны.

У археалагічнай навуцы больш за 40 гадоў існуе гіпотэза выхаду продкаў сучасных славян з земляў Беларускага Палесся. Гэта тэорыя падтрымліваецца шэрагам вядучых спецыялістаў у галіне раннеславянскай археалогіі. «Аднак Беларускае Палессе да цяперашняга часу застаецца практычна белай плямай на археалагічных картах III—IV стагоддзяў — эпохі, якая папярэднічала фарміраванню славян і з'яўленню іх на старонках пісьмовых крыніц», — пракаментаваў адкрыццё **кіраўнік археалагічных раскопак дацэнт кафедры археалогіі і спецыяльных гістарычных дысцыплін гістарычнага факультэта Вадзім БЕЛЯВЕЦ.**



Фота 1.

На цяперашні момант на месцы археалагічных раскопак знойдзена калекцыя дэталяў касцюма і ўпрыгожванняў канца II — IV стагоддзя нашай эры з эмалямі (фота 1), сярэбраная манета рымскага імператара Камода (фота 2). Можна сцвярджаць, што тут дзейнічаў цэнтр па вытворчасці бронзавых упрыгожанняў і, магчыма, вялася здабыча і апрацоўка жалеза. Серыя знаходак кажа пра тое, што жыхары гэтага паселішча на працягу амаль 200 гадоў падтрымлівалі кантакты са сваімі паўднёвымі і заходнімі суседзямі — гістарычнымі готамі, якія ў гэты час жылі на тэрыторыі сучаснай Украіны і паўднёва-заходняй Беларусі (фота 3).



Фота 2.

Найбольш яркай знаходкай з'яўляецца бронзавы прадмет, які не мае аналагаў на тэрыторыі Усходняй і Цэнтральнай Еўропы. Ён, верагодна, з'яўляецца наканечнікам ножнаў мяча (фота 4). Выраблены быў для шляхетнага ваяра і звязаны з мілітарнай культурай германскіх плямёнаў перыяду Вялікага перасялення народаў. На сёння гэта найбольш позняя знаходка, звязаная з гістарычным помнікам, якая дае падставы меркаваць, што насельнікі паселішча маглі загінуць паміж 400 — 460 гадамі ў выніку набегу дружыны воінаў, якія ўдзельнічалі ў бітвах на тэрыторыі Падунаўя ў эпоху заняпаду Рымскай імперыі.



Фота 3.



Фота 4.

Вадзім Белявец рэзюмаваў: «Вынікі раскопак у Яскавічах дазваляюць выказаць здагадку, што далейшыя археалагічныя даследаванні на Беларускім Палессі дазволяць выявіць і іншыя помнікі, якія адносяцца да эпохі заключнага этапу этнагенезу славян, і тэорыя аб тым, што прарадзімай сучасных славянскіх народаў было менавіта Палессе, атрымае новыя пацвярджэнні».

Надзея НІКАЛАЕВА

ЧЫРВОНКА
ЧЫРВОНАЯ ЗМЕНА
19 ЛІПЕНЯ 2018 г.
ЧАЦВЕР
№ 14 (15845)
Выдаецца з 21 красавіка 1921 года

Імёны

Кацярына РАЕЦКАЯ:

# «ПАДАРОЖЖЫ ЛЕПШЫЯ ЗА НОВЫЯ ТУФЛІ»



**Ужо ў дзяцінстве яна ведала, што хоча прадзюсіраваць «Славянскі базар», таму без ваганняў абрала месцам вучобы Беларускі дзяржаўны ўніверсітэт культуры і мастацтваў. Зараз яе дзень распісаны амаль па хвілінах: здымкі, праца за кадрам, канцэрты, шматлікія сустрэчы... Пра цягу да кніг, падарожжы і стаўленне да злаcлівых каментарыяў у свой адрас TV&EVENT-прадзюсар, PR-менеджар, вядучая мерапрыемстваў, салістка гурта «DaVinci» расказала «Чырвонцы. Чырвонай змене».**

***— Давайце паспрабуем узнавіць адзін дзень з жыцця Кацярыны Раецкай... Які ён?***

— Мая раніца пачынаецца з душу, масак і працэдур для твару і, канешне, з кавы. Я вельмі радуюся, калі здымкі і мерапрыемствы запланаваны на другую палову дня: тады ў першай ёсць час для спартзалы або масажу, пасля якіх я альбо працую дзесьці ў горадзе, альбо прызначаю сустрэчы з кліентамі.

Калі запланаваны важныя здымкі, мерапрыемствы, да іх патрэбна падрыхтоўка. І як бы я ні старалася звесці яе да мінімуму — я маю на ўвазе менавіта грым, прычоску, — усё роўна гэта займае каля 1,5-2 гадзін. Часам прафесійнага грымёра на пляцоўцы няма, тады даводзіцца займацца ўсім самой. У гэтым плане značна прасцей майму калегу, сувядучаму і мужу *(Дзянісу Дудзінскаму. —* **Аўт.**): расчасаўся — і прыгожы! *(Усміхаецца.)*

Як правіла, калі ўвесь тыдзень у мяне распісаны, то да пятніцы я адчуваю, што ўжо не хачу нікуды ісці, а мару проста паляжаць дома з кніжкай. І вельмі добра, што мае сябры, знаёмыя, калегі разумеюць: інтраверту, які працуе ў экстравертнай сферы, трэба часам адпачываць.

***— Вы з Дзянісам шмат падарожнічаеце. Куды ўжо ўдалося з'ездзіць у гэтым годзе?***

— Мы былі ў Нікарагуа, Гандурасе. Звычайна яшчэ вясной-летам езджу ў Барселону, але сёлета, на жаль, не складваецца. Хацела паспець да «Славянскага базару», але зразумела: альбо пашыў і прымерка сукенкі, альбо Барселона.

Спадзяюся, што ў жніўні адправімся ў Эфіопію, а бліжэй да новага года — у якую-небудзь еўрапейскую краіну. Але ўсё роўна так атрымліваецца, што мы заўсёды арыентуемся на адпачынак Дзяніса ў праграме «Добрай раніцы, Беларусь!».

***(Заканчэнне на 8-й стар. «ЧЗ».)***

Нябачныя масты

# Зялёная Беларусь і аранжавы Ерэван,

## або Што аб'ядноўвае нашых і армянскіх студэнтаў

**Ужо чацвёрты год дзве навучальныя ўстановы — Беларускі дзяржаўны педагагічны ўніверсітэт і Армянскі дзяржаўны педагагічны ўніверсітэт імя Хачатура Абавяна — рэалізуюць летнюю школу «Пазнай Беларусь: ад адукацыі да культуры». У рамках міжнароднага праекта дзесяць дзён студэнты з Арменіі, Чэхіі, Кітая і Туркменістана гасцявалі ў Беларусі.**

Выкладчыкі ўніверсітэта ўвесь гэты час вучылі замежных студэнтаў асновам беларускай мовы, раскрывалі ім сакрэты народнай творчасці, знаёмілі з сістэмай айчыннай вышэйшай адукацыі і ўмовамі паступлення і навучання ў магістратуры, аспірантуры і дактарантуры. Таксама для гасцей была распрацавана разнастайная культурная праграма.

— Мы з'ездзілі ў Хатынь, музей народнай архітэктуры і побыту ў Азярцы і манастыр, — дзеліцца ўражаннямі **студэнтка аддзялення тэлежурналістыкі факультэта культуры Армянскага дзяржаўнага педагагічнага ўніверсітэта (АДПУ) Сона ХАЧАТРАН.** — У нас у Ерэване таксама ёсць месца, падобнае на Хатынь. Гэта Цыцэрнакаберд, мемарыяльны комплекс, створаны ў памяць аб ахвярах генацыду армян у 1915 годзе ў Асманскай імперыі. Увогуле, калі я прыехала ў Мінск, то мне горад падаўся нейкім ціхім у параўнанні з Ерэванам, нават у самых ажыўленых месцах. І значна большым, бо ў нас нават падчас простага шпацыру сустракаеш сваякоў, сяброў і знаёмых. А яшчэ ўразіў беларускі клімат. У Ерэване ў гэты час года слупок тэрмометра стабільна сягае за трыццаць пяць градусаў у цені. Калі мы прыехалі ў Мінск, то літаральна праз пару дзён быццам бы трапілі ў восень. Было вельмі нязвыкла, што ў разгар лета ўдзень можа быць усяго 10—15 градусаў цяпла, моцныя дажджы і парывісты вецер.



***(Заканчэнне на 2-й стар. «ЧЗ».)***

Камертон настрою

# «МАЕ МАРЫ ЗДЗЯЙСНЯЮЦЦА ЎЖО ЗАРАЗ»



**Міхаіл ЛІЛА — адзін з самых маладых акцёраў Беларускага дзяржаўнага акадэмічнага музычнага тэатра. Калегі кажуць, што ён вельмі пазітыўны і жыццярадасны. Хлопец у трупе з 2015 года і за гэты час паспеў шмат чаго дасягнуць.**

**Калі Міша быў маленькі, ён і падумаць не мог, што апынецца ў тэатры. З самага дзяцінства спяваў, удзельнічаў у міжнародных конкурсах. За гэты час атрымаў больш за 30 першых прэмій і гранд-прэмій, стаў трохразовым лаўрэатам спецыяльнага фонду Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь па падтрымцы таленавітай моладзі.**

— Аказаўся ў тэатры я наступным чынам. На другім курсе акадэміі музыкі выкладала Ганна Дзмітрыеўна Матрная — рэжысёр нашага тэатра. Яна мяне заўважыла і пасля некалькіх месяцаў прапанавала праслухацца. Я спужаўся, сказаў, што яшчэ недастаткова падрыхтаваны і гэта занадта рана. Потым працаваў з салісткай тэатра Лідай Кузьміцкай, яна параіла мне тое ж самае. У выніку адважыўся і прыйшоў, мяне адразу ўзялі як саліста-вакаліста, — кажа хлопец.

Звычайны дзень Мішы выглядае прыкладна так.

— Устаю а дзявятай гадзіне. Прыязджаю ў тэатр крыху раней, каб распецца і разагрэцца каля станка. З 11 да 14 гадзін праходзяць рэпетыцыі: танцавальныя, вакальныя, аркестравыя. Потым еду ў кансерваторыю на пары, далей трыццаціхвілінны перапынак і зноў еду ў тэатр, дзе пройдзе спектакль або наступная рэпетыцыя. Вызваляюся а 10-11-й гадзіне вечара. Дома вучу словы для новых роляў, паўтараю старыя. Кладуся спаць а 2-3-й гадзіне ночы, і так кожны дзень, — расказвае суразмоўнік.

***(Заканчэнне на 3-й стар. «ЧЗ».)***

Свята маладых

# У ВІЦЕБСКУ БЫЛО КРУТА!

**Традыцыйны Дзень моладзі на міжнародным фестывалі мастацтваў «Славянскі базар у Віцебску» і сёлета стаў святам з вялікай літары. Улічваючы, што ў Беларусі Год малой радзімы, яго «лейтматывам» была тэма «Мой родны кут, як ты мне мілы».**

У арт-парадзе «БелаРусь у Сэрцы Маім!», які адкрываў свята і адбыўся на адной з галоўных вуліц фестывальнага горада — Леніна, бралі ўдзел каля 700 чалавек. У калоне можна было ўбачыць спартсменаў, танцораў, музыкантаў, «жывыя скульптуры», дзяўчат, якія сталі прызёрамі і пераможцамі конкурсаў прыгажосці, прадстаўнікоў розных інтарэсаў і кірункаў, якія цікавяць моладзь...

Эпіцэнтрам святкавання стала галоўная плошча горада, тут працавалі пляцоўкі фестывалю дваровых гульняў «Альтэрнатыва», тых, хто за здаровы лад жыцця, за творчую рэалізацыю... Сярод удзельнікаў было многа захопленых варкаўтам, хіпхопам, сілавым экстрымам і г. д. Традыцыйна ў праграме святкавання былі фінальны гала-канцэрт маладзёжнага фестывалю «Агонь танца», фінал рэспубліканскага конкурсу «Бітва дыджэяў».

Арганізатары пастараюцца зрабіць у будучыні свята яшчэ больш захапляльным і разнастайным. І гатовыя ўлічыць самыя цікавыя прапановы. Іх можна пакідаць на сайце Беларускага рэспубліканскага саюза моладзі.

**Аляксандр ПУКШАНСКІ.**

Новы погляд

# ЧАС ДЗЕЙНІЧАЦЬ

## Як моладзь вывучае праблему гандлю людзьмі

**18 актыўных маладых людзей сабраліся ў летнім лагеры пад Мінскам, каб больш даведацца і знайсці свой спосаб супрацьстаяць адной з глабальных пагроз сучаснасці — гандлю людзьмі. У прагараме ў хлопцаў і дзяўчат — шэсць дзён, насычаных яркімі майстар-класамі з аўтарытэтнымі экспертамі.**

Лагер пад назвай «Вывучай. Дзейнічай. Падзяліся» праходзіць ужо другі раз. Леташняе мерапрыемства паказала вялікую цікавасць з боку моладзі, таму сёлета была сабрана новая група неабыякавых да тэмы актывістаў. Ініцыятарам правядзення лагера выступіла прадстаўніцтва Міжнароднай арганізацыі па міграцыі ў Беларусі сумесна з Міністэрствамі замежных і ўнутраных спраў. Акрамя таго, праект падтрымалі розныя агенствы ААН: ПРААН, ЮНІСЕФ, ЮНФПА, Дэпартамент грамадскай інфармацыі (ДГІ) ААН, УВКБ ААН, ЮНЭЙДС сумесна з USAID — Агенцтвам ЗША па міжнародным развіцці. Не засталіся ўбаку і прадстаўніцтвы МЗС Каралеўства Нарвегія і пасольства Вялікабрытаніі ў Рэспубліцы Беларусь, а таксама камерцыйныя арганізацыі, якія выступілі ў якасці спонсараў.

— Гандаль людзьмі з'яўляецца адной з найбольш небяспечных праяў арганізаванай транснацыянальнай злачыннасці. З 2002 года ў Беларусі выяўлена больш за 5600 ахвяр гандлю людзьмі, з якіх каля 5000 — ахвяры сексуальнай эксплуатацыі. Многае зроблена, каб мінімізаваць маштабы гэтай з'явы. Вядома, у адзіночку мы б не змаглі з гэтым справіцца, у нас напрацаваны добрыя сувязі з замежнымі калегамі і грамадскімі арганізацыямі. Правядзенне такога лагера — адна з мер прафілактыкі ў маладзёжным асяроддзі негатыўных з'яў, звязаных з гандлем людзьмі, — падкрэсліў падчас адкрыцця лагера **намеснік начальніка галоўнага ўпраўлення па наркакантролі і супрацьдзеянні гандлю людзьмі (МУС) Уладзімір ЕМЯЛЬЯНАЎ.**

Часам правядзення лагера — сярэдзіна лета — абрана нездарма: 30 ліпеня адзначаецца Сусветны дзень барацьбы з гандлем людзьмі. Дарэчы, менавіта Беларусь стала ініцыятарам надання яму ў 2013 годзе афіцыйнага статусу. Па даных Міжнароднай арганізацыі працы, на дадзены момант больш за 20 мільёнаў чалавек ва ўсім свеце з'яўляюцца ахвярамі прымусовай працы, прычым каля 70 % з іх — жанчыны і дзеці. Як расказаў **кіраўнік прадстаўніцтва Міжнароднай арганізацыі па міграцыі ў Рэспубліцы Беларусь Зейнал ГАДЖЫЕЎ,** на гэты год запланавана падпісанне глабальнага дагавора аб міграцыі. Ён стане першым пагадненнем, дасягнутым у выніку міжурадавых перагавораў і заключаным пад эгідай ААН, якое ахопіць усе аспекты міжнароднай міграцыі. Як чакаюць эксперты, гэта дапаможа істотна паўплываць у тым ліку і на праблему гандлю людзьмі.

Вяртаючыся да работы лагера: нягледзячы на тое, што гэтая тэма стала асноўнай, удзельнікі таксама закрануць пытанні спынення распаўсюджвання ВІЧ і СНІД, бежанства, устанаўлення гендарнай роўнасці і многае іншае. Увогуле — абмяркуюць усё тое, што звязана з Мэтамі ўстойлівага развіцця, якія былі прынятыя дзяржавамі — членамі ААН. Усяго мэт 17, і накіраваны яны ў глабальным сэнсе на ліквідацыю галечы, барацьбу з няроўнасцю і несправядлівасцю, а таксама на рашэнне праблем, звязаных з кліматычнымі зменамі.



Асноўная мэта лагера — растлумачыць, што кожны чалавек са свайго боку можа зрабіць, каб спыніць распаўсюджванне гэтых з'яў. Тое, што ўнесці свой уклад у змяненне сітуацыі да лепшага сапраўды можа кожны, незалежна ад свайго ўзросту, месцазнаходжання і сацыяльнага статусу, даказвае падбор удзельнікаў лагера. Гэта маладыя людзі ва ўзросце ад 18 да 25 гадоў з усёй Беларусі з розным жыццёвым і валанцёрскім вопытам. Каб стаць удзельнікам, трэба было ўсяго толькі запоўніць анкету, канчатковае ж рашэнне прымала конкурсная камісія. Так, напрыклад, выбраная **Аліна МЕТНЕР** працуе педагогам-арганізатарам у цэнтры дадатковай адукацыі дзяцей і моладзі «Росквіт» у Бабруйску, а таксама з'яўляецца валанцёрам грамадскага аб'яднання «Маці супраць наркотыкаў». Там актывістка вядзе клуб для дзяўчат, таму адна з мэт наведвання лагера — атрымаць новую карысную інфармацыю, якой можна будзе падзяліцца з падапечнымі экспертнага пункту гледжання. Акрамя таго, па выніках работы лагера яго ўдзельнікі прадставяць свае праекты на тэму міграцыі або процідзеяння гандлю людзьмі, якія будуць рэалізоўвацца на працягу наступнага года ў рэгіёнах пры падтрымцы экспертаў і агенцтваў ААН.

Як расказала ўдзельніца лагера мінулага года **журналістка Яўгенія ЛЕСНІКОВА,** праект дазволіў не толькі значна больш даведацца аб праблеме гандлю людзьмі, але і бліжэй пазнаёміцца з дзейнасцю спецыяльных устаноў ААН, а таксама ўсталяваць кантакты з актывістамі з розных сфер. У сакавіку гэтага года ўдзельнікі сабраліся на двухдзённую сустрэчу, каб падзяліцца сваім вопытам арганізацыі і ўдзелу ў мерапрыемствах, на якія іх натхніла навучанне. Плануецца, што фармат бесперапыннага ўзаемадзеяння будзе прымяняцца і далей. І, як у прывітальным слове падкрэсліў кожны з экспертаў, калі пасля ўдзельнікі падзеляцца атрыманай інфармацыяй хоць бы з блізкімі — значыць, праца праведзена не дарэмна.

**Дар'я КАСКО.**

# Зялёная Беларусь і аранжавы Ерэван...



***(Заканчэнне. Пачатак на 1-й стар. «ЧЗ».)***

А яшчэ я навучылася крыху размаўляць па-беларуску. Пры веданні рускай лексікі беларуская мова здаецца не такой складанай у параўнанні з армянскай. І граматыка ў вас адвольная, здаецца, чым у параўнанні з нашай.

На просьбу згадаць вядомыя ёй беларускія словы (зразумела, што за дзесяць дзён мову не вывучыш, каб бегла на ёй размаўляць) Сона секунду дзесяць разважае, а пасля прамаўляе: «Дзякуй», «Калі ласка», «Прывітанне», «Добрай раніцы» і тут жа перакладае іх на рускую. Памылак няма, адзінае — вуха прыкмячае акцэнтаванае вымаўленне. Але хто з нас размаўляе на замежнай мове без акцэнту?

— Я больш за дзесяць гадоў пражыў у сярэдняй паласе Расіі, — кажа **студэнт факультэта інфарматыкі, фізікі і матэматыкі АДПУ Грыгорый АЙРАПЕЦЯН.** — Пасля бацькі пераехалі ў Арменію. Але і там сувязь са славянскай культурай не перарвалася. Я хадзіў у школу з рускай мовай навучання. І, як бачыце, мы з вамі цудоўна разумеем адзін аднаго. Скажу так: калі браць не асобныя словы, вырваны з кантэксту, а менавіта прамову на беларускай мове, то я зразумею ўсё, але адкажу вам па-руску. З арфаграфіяй цяжэй — усё ж такі ў рускай мове няма прынцыпу «як чуецца, так і пішацца». Да таго ж і ў прафесійным лексіконе мы выкарыстоўваем шмат тэрмінаў, якія агульныя і для армянскай, і для рускай, і для беларускай моў.

***— А што вам падалося самым незвычайным у Беларусі?***

— Архітэктура. Ерэван не спазнаў ваеннага ліхалецця, таму шмат архітэктурных помнікаў у нас ацалела. Дамы, узведзеныя за савецкім часам, у нас таксама ёсць, як і ў Мінску, але аблічча горада яны не ствараюць. Ды і наша гісторыя больш старажытная, што таксама наклала свой адбітак. Напрыклад, у Ерэване ёсць развалiны крэпасці Эрэбуні, якая была ўзведзена яшчэ ў 782 годзе да нашай эры, нават раней за дату заснавання Рыма! Таксама ў нас амаль усе дамы пабудаваны з вулканічнага туфу. Калі паглядзець на Ерэван з ілюмінатара самалёта, то ён падаецца ружовым і аранжавым. А ў Беларусі гор няма, туфу таксама. Затое ў вас шмат лясоў. І таму нам было вельмі цікава паглядзець на тое, як і дамы, і гаспадарчыя прылады рабіліся з дрэва. Мяне вельмі ўразіла падарожжа ў музей народнай архітэктуры і побыту.

— А яшчэ ваша сталіца вельмі зялёная, — заўважае **студэнт з Туркменіі Еэіз ШАРЫПАЎ.** — Мне вельмі падабаецца мясцовасць каля Нямігі — шмат дрэваў, чыстая Свіслач, прасторна, цікавы архітэктурны комплекс. Ды і калі едзеш па-за горадам, таксама нязвычна зелена, безліч лясоў, птушкі спяваюць... Горад Мары, адкуль я родам, знаходзіцца ў аазісе пасярод пустыні Каракум. У нас пейзажы зусім іншыя.

**Мелко МЕЛКАНЯН, які вучыцца ў АДПУ на кінааператара на факультэце культуры,** дадае: «Мы былі ў Верхнім горадзе на вечары джазавай музыкі. Спадабаліся таксама і песні беларускіх гуртоў, якія гучалі на канцэртах. Таксама наведалі Дзень вышыванкі і паўдзельнічалі ў святкаванні Дня Незалежнасці. Парад, гала-канцэрт, салют — гэта ўсё вельмі запамінальна. Але я крыху змерз, таму што хто ж мог ведаць, што ў Мінску лета адступіць у самай яго кульмінацыі! А яшчэ мы ездзілі ў лагер «Палітэхнік». Там разам са студэнтамі БНТУ святкавалі Купалле».

Цікава, што армянскія студэнты хоць і навучаюцца ў адным універсітэце, але адно аднаго да паездкі ў Беларусь не ведалі. Рыхтуючыся да яе, стварылі спецыяльны чат у «Вайберы», праз які і абмяркоўвалі ўсе арганізацыйныя пытанні. А «развіртуаліліся» яны толькі ў аэрапорце Ерэвана.

— Сама ідэя Летняй школы ўзнікла ў рэктараў БДПУ і АДПУ Аляксандра Жука і Рубэна Мірзаханяна пры сустрэчы ў Армянскім дзяржаўным педагагічным універсітэце ў 2015 годзе, — расказала **начальнік упраўлення міжнароднага супрацоўніцтва БДПУ Святлана КАБАЧЭЎСКАЯ.** — На парытэтных умовах мы абменьваемся студэнтамі. Касцяк гасцей ужо па традыцыі складаюць студэнты з Ерэвана. А ў канцы лета нашы студэнты адправяцца ў Арменію, каб дакрануцца да гісторыі і культуры гэтай краіны.

Дарэчы, цікавы выпадак адбыўся падчас першай Летняй школы, якая праходзіла ў 2015 годзе на тэрыторыі Беларусі і Літвы. Мы тады паехалі ў Вільнюс. Армяне гутарылі паміж сабой па-армянску, і вось да іх падышоў нейкі чалавек, паслухаў і сказаў: «Хлопцы, вы —- нашы!» Выйшла, што ў Літве сустрэліся армяне з Мінска і Ерэвана. Таму мы ўключылі ў праграму і сустрэчу з прадстаўнікамі армянскай дыяспары, якая жыве ў Беларусі, каб яе члены дапамагалі гасцям спазнаваць нашу краіну.

— Я нарадзіўся ў Арменіі ў горадзе Абавян, — гаворыць **старшыня маладзёжнай дыяспары армян Мінска, выкладчык БДПУ Карэн МУРАДЗЯН.** — Жыву ў Мінску з чэрвеня 1999 года. Мне было 10 гадоў, калі мы пераехалі сюды разам з бацькамі. Раней жылі ў Расіі, пасля — у Арменіі. Але бацькі вырашылі, што лепш мне даць адукацыю за мяжой, тым больш што ў таты ў Мінску тады была свая справа. Канешне, ментальнасць у беларусаў і армян розная. Што аднолькавае, дык гэта гасціннасць: калі ў доме адзін ложак, то госця пакладуць менавіта на яго. Але шмат сітуатыўных рэчаў чалавек, які ўпершыню трапіў у Беларусь з Арменіі, адразу не зразумее. Таму мы стараліся ўсе нюансы тлумачыць. І спадзяёмся, што сённяшнія госці яшчэ не раз прыляцяць у Мінск...

**Валяр'ян ШКЛЕННІК.**

Свой стыль

# НА ДАРОЗЕ — АЎТАЛЭДЗІ!

## А яшчэ на працы, у... гаражы і на рыбалцы



**«Мяне цяпер на мясцовых запраўках пазнаюць, уяўляеце?» — з усмешкай расказвае Алена ЧУРЛОЎСКАЯ. Бухгалтар Клецкага камбікормавага завода прывыкла быць пільнай не толькі пры рабоце з дакументамі, але і за рулём, напэўна, таму і стала найлепшым кіроўцам-дзяўчынай у Мінскай вобласці. Гэта бойкая аўталэдзі можа справіцца з любой машынай і не дасць сябе ў крыўду дарожным хамам.**

Правы Алена атрымала пяць гадоў таму.

— Мне заўсёды хацелася ўмець кіраваць. Класна ўсюды паспяваць, быць мабільнай і не залежаць ні ад кога. Доўга збіралася з думкамі і нарэшце запісалася ў аўташколу. Паставіла сабе мэту адразу здаць экзамен, без пераздач. Так і атрымалася.

Кіраваць дзяўчына вучылася ў Баранавічах, дзе тады працавала па размеркаванні. На першых практычных занятках інструктар пасадзіў яе за руль адразу ў цэнтры горада. «А я ведала толькі, дзе газ і тормаз і як першую-другую перадачы ўключаць», — успамінае Алена свае тагачасныя хваляванні.

Першая машына з'явілася ў яе праз паўгода пасля атрымання правоў. Гэта быў старэнькі «фіят» 1998 года.

— Мы з ім разам вучыліся ездзіць, — смяецца суразмоўніца. — Калі купляла, асабліва не прыглядалася: я ў аўтамабілях тады не разбіралася. Тата прапанаваў: «Давай машыну ў парадак прывядзём, падфарбуем». Казала яму: «Не, пачакай, я яшчэ ніводнага слупа не збіла. Саб'ю — потым пафарбуем». На шчасце, гэты момант так і не настаў.

Калі Алена крыху набралася вопыту, вырашыла змяніць свайго «жалезнага каня» на больш новага, і вось ужо паўтара года як ездзіць на Volkswagen Polo, «Полік», як яго ласкава называе дзяўчына.



— Гэты раз да выбару машыны падышла грунтоўна. Галоўным крытэрыем была надзейнасць. Можна было за тую ж цану ўзяць аўто вышэйшага класу, але тады давялося б браць больш старую машыну. Гэта значыць, вялікі прабег і шмат праблем. Таму купіла больш бюджэтную, затое 2013 года выпуску. Потым даведалася, што там ёсць такая цудоўная функцыя, як абагрэў лабавога шкла. Зімой усе шчыруюць скрабкамі, а ты проста ўключаеш кнопачку і сядзіш. Калі не моцны мароз, хвілінкі дзве трэба пачакаць, пакуль снег на шкле адтае, — і можна ехаць. Для дзяўчыны — проста супер!

У Алены сярод сяброў шмат хлопцаў, таму па выхадных яна часта «завісае» ў гаражах: вучыцца разбіраць машыны і разбірацца ў іх. Можа самастойна паставіць новыя свечкі і салонны фільтр, праверыць калодкі на ступень зносу. Толькі масла сама не мяняе. «Мне здаецца, я ўсё заляпаю — не жаночая гэта справа», — жартуе.

Паўдзельнічаць у мінскім абласным этапе рэспубліканскага маладзёжнага конкурсу «АўтаЛэдзі-2018», які праводзіць БРСМ, Алена вырашыла спантанна. Спадзявалася паказаць высокі вынік, але на першае месца не разлічвала. Найбольш перажывала за візітную картку: дагэтуль у дзяўчыны не было вопыту публічных выступленняў. А вось практыка яе не пужала: падвесці магла хіба толькі дыяганальная паркоўка.

— На тэставым заданні адну памылку зрабіла, — прызнаецца Алена. — Там вельмі гучна грымела музыка, таму няпроста было засяродзіцца. Нават інспектар ДАІ потым прызнаўся: «У такіх умовах не кожны мужчына змог бы так адказаць».

Дарэчы, пра апошніх. З іх прадузятым стаўленнем да кіроўцаў жаночага полу Алена сутыкаецца часта. «Калі хтосьці накасячыць на дарозе, адразу кажуць: «Усё зразумела: баба за рулём». Потым пад'язджаеш, а там хлопец сядзіць, — прыводзіць прыклад суразмоўніца. — Часам мужчыны хочуць «правучыць» мяне на святлафоры. Але гэта ў іх не атрымліваецца». *(Усміхаецца.)*

Саму аўталэдзі на дарозе раздражняюць паводзіны кіроўцаў BMW. Смяецца: не ведае, што гэта машына робіць з людзьмі, але яны паводзяць сябе занадта самаўпэўнена: любяць падрэзаць.

Сябры ездзяць з Аленай не баяцца, нават свае аўтамабілі ёй давяраюць. А вось сама дзяўчына раней перажывала, калі пачыналася зіма: раптам на слізкай дарозе занясе? Ёй тады параілі: зрабі сабе кіраваны занос (на адкрытай пляцоўцы, па-за межамі населенага пункта) і паглядзі, як з яго выедзеш. Алена паспрабавала. Успамінае, што, нягледзячы на паніку, змагла «выкруціцца».

Што ў багажніку машыны аўталэдзі? «Запаска», дамкрат, ключ, буксіровачны трос... і маленькае крэсла.

— На рыбалку ездзіць, — з усмешкай тлумачыць суразмоўніца. — Для гэтага ў мяне ў машыне яшчэ ляжыць цёплая куртка. Побач з Клецкам ёсць некалькі азёраў. Мы разам з хлопцам туды выбіраемся. У асноўным ловім карася. Калі ў гадзін шэсць вечара паехаць пасля работы, можна дацямна прасядзець, калі добра рыба бярэцца. А вось начныя і зімнія рыбалкі — не мае.

За год дзяўчына намотвае за рулём каля 15 тысяч кіламетраў. У асноўным ездзіць па Клецку. Па выхадных бывае ў суседніх гарадах. Напрыклад, вельмі любіць Нясвіж. Жартуе, што столькі разоў наведвала замак, што ўжо, напэўна, можа працаваць там гідам.

Просім Алену даць некалькі парад кіроўцам-навічкам.

— Перш чым ісці на правы здаваць, трэба вызначыцца для сябе, ці зможаш ты потым кіраваць. На дарозе неабходна думаць не толькі за сябе, але і за таго, хто едзе побач, — адзначае дзяўчына. — Калі машына раптам заглухне, ты павінен не разгубіцца і ведаць, што рабіць. Ёсць жанчыны-кіроўцы, якія проста кідаюць руль і ўпадаюць у істэрыку — такія паводзіны недапушчальныя. Галоўнае — не баяцца і практыкавацца. Калі ведаць правілы і быць упэўненай у сабе, усё ў вас абавязкова атрымаецца.

**Наталля ЛУБНЕЎСКАЯ.**
*Мінск — Клецк — Мінск.*

# «МАЕ МАРЫ ЗДЗЯЙСНЯЮЦЦА ЎЖО ЗАРАЗ»

*(Заканчэнне.
Пачатак на 1-й стар. «ЧЗ».)*

У такім складаным графіку Міхась паспявае і добра вучыцца. Кажа, што яму лягчэй за астатніх з-за выдатнай падрыхтоўкі ў музычным каледжы. Педагогі ўсё разумеюць і заўсёды дапамогуць, яны цэняць людзей, захопленых сваёй будучай прафесіяй. Бацькі Мішы таксама ўхваляюць яго занятак. «У мяне цудоўная сям'я, якая ва ўсім дапамагае. З музыкай, праўда, звязаны толькі я, але бацькі задаволены, што выбраў менавіта тэатр, і ганарацца мной». Публіка вельмі ўплывае на акцёраў, кажа хлопец. На шчасце, у музычным тэатры зала заўсёды поўная, ёсць для каго выступаць, шмат пастаянных гледачоў:

— Усё роўна — адзін чалавек ці дзесяць тысяч — мы павінны адыгрываць на поўную моц. І заўсёды назіраем эфект бумеранга: запускаеш сапраўдную эмоцыю і яна вяртаецца да цябе з неверагоднай аддачай, — дзеліцца Міша.

Перад выхадам на сцэну ногі і рукі не трасуцца, але хваляванне прысутнічае заўсёды — ніколі не ведаеш, як пройдзе наступная хвіліна спектакля. Як кажа суразмоўнік, не бывае двух аднолькавых выступленняў. «Усе мы людзі, і нельга забываць пра чалавечы фактар. Бываюць розныя выпадкі, у тым ліку трагічныя, але артыст выходзіць і робіць сваю справу. Тады на сцэне з'яўляюцца зусім іншыя эмоцыі».



Работу ў тэатры Міша ўяўляў зусім па-іншаму. Ён думаў, што будзе проста спяваць, прыгожа хадзіць па сцэне, часам танцаваць. Калі апынуўся тут, зразумеў, што яшчэ вельмі юны ў творчым плане. Спачатку адчуваў сябе няўтульна, але гэта прымусіла яго працаваць з асаблівай стараннасцю. «Я не быў гатовы да таго, што ўсё павінна быць на такім высокім узроўні. Як кажа наш рэжысёр, мы павінны спяваць як у оперы, танцаваць як артысты балета і чытаць як акцёры драматычнага тэатра. Гэтым мы і адрозніваемся ад іншых».

У тэатры Мішу ведаюць як самага аптымістычнага калегу, ён заўсёды ў добрым настроі.

— Усміхайцеся, у якім цяжкім становішчы ні былі б, таму што ўсмешка ўздымае настрой і чароўна дзейнічае на іншых людзей, — упэўнены хлопец.

**Як кажа наш рэжысёр, мы павінны спяваць як у оперы, танцаваць як артысты балета і чытаць як акцёры драматычнага тэатра.**

Творчая мара маладога акцёра ўжо здзейснілася. «Лятучы карабель» — любімы мультфільм яго дзяцінства, ён заўсёды бачыў сябе ў вобразе Вані. Не так даўно Міхаіла зацвердзілі на гэтую ролю, і яна ідэальна кладзецца на голас артыста. З рускіх казак мы памятаем Івана-дурня, а тут акцёр дэманструе Івана-печніка, разумнага, культурнага. Таму Міхаіл з трапятаннем ставіцца да гэтай ролі.

Думак, звязаных з тэатрам, у суразмоўніка шмат, а вось над пытаннем пра самую запаветную жыццёвую мару ён задумаўся.

— Неяк мы ладзілі дабрачынны канцэрт, каб сабраць сродкі на аперацыю хлопчыку. Нашы грошы вельмі дапамаглі яму, і цяпер ён здаровы. Калі разумееш, што сваім талентам можаш дапамагчы выратаванню жыцця, ты абсалютна шчаслівы, гэта не перадаць словамі, адчуваеш найвышэйшую асалоду. Так павінны рабіць усе. Неабавязкова дапамагаць матэрыяльна, часам досыць звычайнай падтрымкі або ўсмешкі. Няма ў жыцці нічога лепшага за такія справы, — такім быў адказ Мішы. — Таму я не магу назваць пэўную запаветную мару, я проста лічу, што яны здзяйсняюцца ўжо зараз.

**Паліна МІГІНЕВІЧ.**

*У спарынгу з сабой*

# ЖЫЦЦЁВАЙ МІТУСНІ — БОЙ!

## У гэтых словах — матывацыя чэмпіёнкі краіны па муай-тай



**Гледзячы на ўраджэнку Чэрвеня Вольгу ЖУРАЎСКУЮ, нямногія здагадаюцца, што гэта спакойная і сціплая жанчына сёлета праз напружаную барацьбу здабыла тытул чэмпіёнкі Беларусі па муай-тай.**
**Але залаты медаль — не самае важнае дасягненне 31-гадовай суразмоўніцы. Жыццёвыя ўзнагароды для яе — маленькая, але моцная сям'я (мама, сястра, сын Улад) і любімая праца ў мясцовым тэрытарыяльным цэнтры сацыяльнага абслугоўвання насельніцтва.**

***— Вольга, раскажыце, калі ласка, пра ваша дзяцінства...***

— Усё было звычайным. Камп'ютара, інтэрнэту не было — вольны час бавілі на вуліцы. Я, хутчэй, больш спакойная была, чым сарвігалава. Аднак вельмі любіла з хлапчукамі гуляць у казакоў-разбойнікаў. Бегалі па ўсім горадзе! Яшчэ, памятаю, па дрэвах, платах лазілі. Нават на галінах бярозы каталіся.

***— Ці былі перадумовы да заняткаў спортам?***

— Цягі да яго я не мела. Хіба што ў школе крыху гуляла ў баскетбол. Неяк запісалася на лёгкую атлетыку, але яна мяне не зачапіла. Галоўным захапленнем было маляванне. Наведвала заняткі ў школе мастацтваў, удзельнічала ў творчых конкурсах. Я і зараз часам малюю. А тады марыла стаць дызайнерам адзення, таму і паступіла ў каледж швейнай вытворчасці. Але калі пачалося канструяванне... Дакладнасць, падлікі, вымярэнні цярпець не магу... Праз гэта ўсвядоміла: не быць мне дызайнерам — ды і кінула вучобу на трэцім курсе, скончыўшы толькі этапы краўца і закройшчыка.

**«Думала: калі сёлета нічога не вазьму, мне будзе сорамна і перад імі, і перад сабой. Не магла не перамагчы! Настроілася: буду біцца да апошняга ўздыху».**

***— І лёс закінуў у тэрытарыяльны цэнтр сацыяльнага абслугоўвання насельніцтва...***

— Не адразу. Я яшчэ паспела год адпрацаваць па спецыяльнасці, пасядзець у дэкрэтным адпачынку пару гадоў. Напачатку мне прапанавалі стаць кіраўніком гуртка ў аддзяленні дзённага знаходжання для інвалідаў. А далей — скончыла педагагічны ўніверсітэт па спецыяльнасці «алігафрэнапедагогіка», пачала рухацца па кар'ернай лесвіцы. Цяпер я — загадчык аддзела.

***— Як жа вы, такая мініяцюрная і спакойная, трапілі ў тайскі бокс?***

— Вырашыла аддаць сына на муай-тай, калі яму было шэсць. А трэнер кажа: «Чаго сядзець і глядзець? Прынось форму, таксама будзеш займацца». Падумала: чаму б і не? Тым больш пасля працы — зручны час. Потым Улад перастаў хадзіць: інтарэсу не ўзнікла. А я засталася!

***— Былі цяжкасці напачатку?***

— Канешне, як у кожнага з нас. Калі штосьці не атрымлівалася, я моцна засмучалася. Усё цела балела, паўсюдна сінякі... Вярталася з трэніровак і адразу клалася адпачываць. А зараз быццам бы імунітэт выпрацаваўся. Прыходжу бадзёрая, яшчэ і справамі хатнімі займаюся!

***— Спарынгі праводзіце?***

— А як жа! Але мне цяжкавата: няма дзяўчат адпаведнай вагі ці росту. Таму даводзіцца стаяць у пары з хлопцамі. Яны, канешне, шкадуюць, з усёй сілы не б'юць. Аднак усё роўна крыху страшна. Чаму? Калі ўзяць хлопца маёй вагі, 55 кілаграмаў, ён усё роўна будзе мацнейшы за мяне. Увойдзе ў кураж — і забудзецца, што я дзяўчына, паб'е мяне. *(Смяецца.)*

***— Вы згадвалі сінякі. А траўмы былі?***

— Аднойчы я нават хадзіла з фінгалам. А мне — на курсы ў Мінск. Не ведаю, што там людзі думалі...

Сур'ёзная траўма была, калі на адным з турніраў зламала мезенец на назе. Цікава, што заўважыла не адразу. Сышла спакойна з рынга, толькі праз нейкі час зразумела, што нешта палец баліць. Потым нага апухла... А назаўтра — яшчэ бой. Нагу перабінтавалі, я аднекуль знайшла сілы выйсці на рынг. На жаль, траўма перашкодзіла перамагчы.

***— Калі нешта не атрымліваецца, апускаюцца рукі. Як знаходзіце матывацыю ў такіх сітуацыях?***

— Вельмі хочацца, каб мной ганарыліся сын, мама, трэнер... Каб бачылі, што недарэмна займаюся. Калі шчыра, то муай-тай — хоць якая разнастайнасць у маім жыцці. А то ўсё дом — праца, праца — дом... Таксама хочацца ўбачыць на трэніроўцы сяброў — ці ж не самая лепшая матывацыя?

***— На сёлетні чэмпіянат Беларусі як сябе настройвалі?***

— Звычайна на спаборніцтвах мне заўсёды чагосьці не хапала: ці сілы волі, ці досведу. Я ж бачу, як рэагуе на мае вынікі трэнер, як перажываюць за мяне і вераць у мяне родныя, калегі. Думала: калі сёлета нічога не вазьму, мне будзе сорамна і перад імі, і перад сабой. Не магла не перамагчы! Настроілася: буду біцца да апошняга ўздыху.

***— Пачуцці чэмпіёнкі, якія яны?***

— Спакой і ціхая радасць. Не было такога: «Ой, глядзіце, я чэмпіёнка!». Толькі на працы медаль паказала дырэктару, Людміле Генадзеўне Шарковай. Спаборніцтвы ж падчас працы праходзяць, яна мяне адпускае, заўжды ідзе насустрач, падтрымлівае, за што я ёй вельмі ўдзячная. Калегі павіншавалі, мама, на трэніроўцы сябры парадаваліся. Нідзе больш не выхваляласся.

***— Вы не трапілі на сёлетні чэмпіянат свету ў Мексіцы. Чаму?***

— На жаль, вельмі дарагая паездка. Трэба было знайсці каля дзвюх з паловай тысяч долараў. Ні ў мяне, ні ў клуба такіх грошай няма. Федэрацыя таксама не здолела прафінансаваць...

***— Кароткае філасофскае пытанне: што для вас спорт?***

— Гэта адпачынак ад працы, ад жыццёвай мітусні, адпачынак для душы. Частка мяне. Без яго ўжо нельга.

**«Вярталася з трэніровак і адразу клалася адпачываць. А зараз быццам бы імунітэт выпрацаваўся. Прыходжу бадзёрая, яшчэ і справамі хатнімі займаюся!»**

...Можна было б задаць яшчэ мільён пытанняў. Мая суразмоўніца з задавальненнем адказвала б на іх, а я — слухала. Але час — найвялікшая каштоўнасць..

У Вольгі — яшчэ каля дзесяці гадоў для рэалізацыі сваіх спартыўных планаў (у муай-тай можна выступаць да сарака гадоў) і яшчэ больш — для дасягнення жыццёвых. Пажадаем ёй поспехаў!

**Юлія АДАМОВІЧ,**
**студэнтка III курса**
**факультэта журналістыкі БДУ.**

### Бліц-апытанка

***— Чым/кім больш за ўсё ганарыцеся?***

— Сынам. І працай.

***— Калі б быў шанц што-небудзь змяніць, што б гэта было?***

— Мабыць, нічога. Думаю, што ўсё ў жыцці не выпадковае. Сумныя і складаныя моманты робяць чалавека мацнейшым. Ва ўсім трэба шукаць станоўчае. Напрыклад, у мяне не склаліся адносіны з мужам, аднак нарадзілася цудоўнае дзіця, якім я ганаруся!

***— Якую музыку любіце?***

— Аўдыязапісы «УКантакце» ў мяне «пад замком»: калі хто-небудзь іх паслухае, падумае, што я дзівачка. Але музыка маёй душы — песні 1980—1990-х. А яшчэ дужа люблю шаманскія барабаны, гукі медытацыі.

***— Калі б выйгралі ў латарэю, што зрабілі б з грашыма?***

— Я ўжо думала над гэтым пытаннем. *(Усміхаецца.)* Спачатку патраціла б на рамонт. Калі буйная сума, то, магчыма, на паездку за мяжу. Не пашкодзіла б крыху грошай і ў наш цэнтр аддаць...

***— Чаго баіцеся больш за ўсё?***

— Мабыць, як і ўсе людзі, каб нічога з роднымі не здарылася.

*І так бывае...*

# «ХУЛІГАНСКАЯ» ГУЛЬНЯ

## Як яна дапамагае «дрэнным хлопцам»?

**Яшчэ ў канцы 1980-х рэгбі ў краіне было адным з папулярных камандных відаў спорту: праходзілі чэмпіянаты БССР, дзейнічалі дзясяткі дзіцячых секцый. Цяпер гэта занятак для энтузіястаў, якія ў вольны ад працы час не толькі трэніруюцца і бяруць удзел у турнірах, але і ўдзяляюць увагу выхаванню падрастаючага пакалення.**

— Нам вельмі блізкая ідэалогія добраахвотных спартыўных таварыстваў, якія былі пры большасці прадпрыемстваў у СССР. Гэта былі свайго роду «пункты збору» людзей, якія не проста шукалі, чым заняць свой вольны час, але і ўдзельнічалі ў сацыяльных праектах, папулярызавалі здаровы лад жыцця, — кажа **Аляксей ГАЙДУКЕВІЧ, трэнер мінскай спартыўнай арганізацыі «Рэгбі-Юніян»**. — У нас займаюцца ў тым ліку хлопцы, якія прайшлі шлях ад непаўналетніх злачынцаў і выпівак да спартсменаў сур'ёзнага ўзроўню. Некаторыя, апроч гульняў за мінскія каманды ў міжнародных турнірах, бяруць удзел у матчах клуба з Вільнюса ў чэмпіянаце Літвы. Не сакрэт, што рэгбі — гульня «хуліганская», таму яна ў большай ступені прыцягвае не зусім «добрых хлопцаў». Як толькі такі малады чалавек зацікавіўся, яго важна захапіць гэтым спортам, скіраваць бурлівую энергію ў патрэбнае рэчышча. А далей сістэмныя заняткі па ўдасканаленні фізічнай сілы, хуткасці і тэхнікі абавязкова выведуць юнака на правільны шлях. Рэгбі — камандны спорт, у нас плячо таварыша па камандзе не раз робіцца апорай у цяжкіх гульнявых момантах.

Асаблівасці гульні і трэніровачнага працэсу, які павінен уключаць і элементы псіхалагічных трэнінгаў, станоўча ўплываюць на моладзь, упэўнены Аляксей.

Пакуль гэты від спорту не такі раскручаны ў Беларусі, але за мяжой у яго шмат паклоннікаў.



— У Францыі — даўнія рэгбійныя традыцыі, можна сказаць, што па папулярнасці гульня там сапернічае з футболам. Але гэта вяршыня айсберга. Аснову складаюць дробныя аматарскія клубы ў невялікіх гарадах, у якіх і вырастаюць будучыя чэмпіёны, — заўважае **прафесійны рэгбіст беларускага паходжання Алег ІШЧАНКА**, які выступае ў Францыі ў клубе Vannes. — Большасць такіх арганізацый — некамерцыйныя аб'яднанні, якім дапамагаюць мясцовыя ўлады. І неабавязкова фінансава: гэта могуць быць бясплатная арэнда палёў, зніжка на камунальныя паслугі і г. д. Важная крыніца фінансавання — клубныя карты. Такога тыпу сістэма дазваляе гульцам самім не плаціць за пераезды па рэгіёне ці за арганізацыю дамашніх матчаў. Матчы рэгіянальных аматарскіх спаборніцтваў прыцягваюць шмат балельшчыкаў, бо клубы фактычна з'яўляюцца «агульнай справай» горада ці раёна. У некаторай ступені спартсмены становяцца прыкладам для моладзі, якая далучаецца да секцый. Асаблівая ўвага ўдзяляецца не толькі папулярызацыі рэгбі і асобна ўзятай каманды, але і ўдзелу гульцоў у розных праектах. Яны ахвотна бяруцца за працу падчас валанцёрскіх акцый, у тым ліку па сацыялізацыі цяжкіх падлеткаў, папулярызацыі здаровага ладу жыцця. У сельскай мясцовасці ці невялікіх мястэчках імпрэзы для моладзі з удзелам гульцоў становяцца сапраўдным святам. Таму я раіў бы і ў Беларусі звярнуць увагу на такую папулярызацыю спорту.

Аляксей Гайдукевіч расказвае, што мінскія рэгбісты імкнуцца не адставаць ад сваіх французскіх калег. Яны наведваюць заняткі па фізкультуры ва ўстановах адукацыі ў спальных раёнах, знаёмяць моладзь з гэтым відам спорту, запрашаюць на трэніроўкі. Асаблівая ўвага аддаецца дзецям, схільным да парушэнняў закону.

— Нашы ідэі і планы знайшлі разуменне ў Мінскай гарадской арганізацыі БРСМ. Пры падтрымцы першага сакратара Сяргея Клішэвіча разам з раённымі інспекцыямі па справах непаўналетніх мы будзем знаёміць цяжкіх падлеткаў з рэгбі падчас больш змястоўных і сістэмных мерапрыемстваў, — паведаміў Аляксей.

У канцы снежня на мінскім стадыёне «Дынама-Юні» прайшоў турнір па рэгбі, у якім удзельнічалі хлопцы, што ўжо мелі праблемы з законам, у тым ліку тыя, якія пачалі трэніравацца ў секцыях увосень 2017 года. Хлопцы прадэманстравалі выдатныя вынікі і, галоўнае, імкненне да развіцця сваіх навыкаў.

**Аляксей ЗАХАРЭВІЧ.**

Свая справа

# ПРАДПРЫМАЛЬНАЕ ХОБІ,

## ці Вялікае задавальненне ад малога бізнесу

**Напэўна, ніхто не будзе спрачацца з тым фактам, што даволі шмат людзей ходзяць на працу... проста па завядзёнцы, з вялікай неахвотай. І ў кожнага свае прычыны: не пашанцавала з кіраўніком, зарплата малая, руціна... І наогул — «гэта зусім не тое, чым мне хацелася б займацца ў жыцці»... Але сярод нас ёсць і такія шчаслівчыкі, якія здолелі любімую справу зрабіць прафесіяй. Сярод іх — жыхарка Смалявіцкага раёна Анастасія САЗОНАВА. У маладой жанчыны — прыватная крама тавараў для творчасці.**



Першы выраб, створаны ўласнымі рукамі яшчэ ў дзяцінстве, суразмоўніца памятае вельмі добра. Гэта быў маленькі дзявочы бранзалет з бісеру... З таго самага часу Анастасія неразлучная з гэтым матэрыялам. Сваёй любімай творчасцю дзяўчына займалася і падчас атрымання прафесіі інжынера-эканаміста ў Жодзінскім тэхнічным тэхнікуме, і працягваючы навучанне ў Беларускім нацыянальным політэхнічным універсітэце, і працуючы па спецыяльнасці на прадпрыемстве ў Смалявіцкім раёне... За дваццаць з лішкам гадоў у Анастасіі набралася шмат цікавых і эксклюзіўных рэчаў: бранзалеты і завушніцы, пацеркі і брошкі, кветкавыя кампазіцыі, так званыя дрэвы шчасця і нават карціны.

Праца на прадпрыемстве Анастасію заўсёды задавальняла, але ж у самых патаемных марах хацелася мець «уласную справу». Каб ні ад кога не залежыць і, калі прыйдзе час, перадаць яе ў спадчыну дзвюм дачушкам — Ксюшы і Веры. Таму, калі паўстала пытанне аб выхадзе на ранейшае рабочае месца пасля двух дэкрэтных водпускаў, рашэнне было прынята хутка: уласнаму бізнесу — быць. На сямейнай нарадзе датацыю ад дзяржавы вырашылі не браць, абысціся ўласнымі сродкамі. Таму і пачынала Анастасія Сазонава зусім з малога — латка на смалявіцкім рынку. Цяпер жа, праз тры з нечым гады, мае невялічкую крамку плошчай 20 квадратных метраў — сапраўдны рай для хэндмэйдараў. У вялікім асартыменце тут прадстаўлена пража: не сакрэт, што амаль самае распаўсюджанае жаночае захапленне — вязанне. Ёсць багаты выбар бісеру і спадарожных тавараў — зашпілек, лёсак і іншага. Знайшлося месца і найноўшым хобі: паеткі, мулінэ, фаміранавае палатно (спецыяльны гнуткі матэрыял для рукадзелля, ён можа прымаць розныя формы), стужкі рознай шырыні для вышываных карцін, фетр, тканіны. Дарэчы, гаспадыня плануе ў далейшым больш увагі ўдзяляць менавіта тканінам і пашырыць іх асартымент.

...Прадпрымальніца прызнаецца, што спаць ёй даводзіцца ў сярэднім толькі па шэсць гадзін у суткі, бо яна — і бухгалтар, і маркетолаг, і забеспячэнец, і дызайнер, і непасрэдна творца і рамеснік... А яшчэ матуля і жонка. Усё ў адной асобе. Але Анастасія прызвычаілася, навучылася планаваць час, і на ўсе гэтыя іпастасі яе хапае. З дачушкамі, зразумела, дапамагаюць бабулі. Муж Андрэй, канешне, — надзея, апора і самы моцны «тыл». Інакш ніяк не здолела б справіцца, прызнаецца жанчына.

Я спытала: ці цяжка гэта — мець уласны бізнес? Ці прыносіць ён добрыя грошы? Ды і наогул, ці не шкадуе Анастасія аб тым, што ўзялася за такую справу і, каб была магчымасць павярнуць час назад, ці пайшла б зноў па гэтым шляху? Суразмоўніца адказала, што, хоць аб вялікіх грашах гаворкі не ідзе і цяжкасцяў дастаткова, але ж, нягледзячы ні на што, зрабіла б тое самае. Бо няма большага шчасця, чым штодня з задавальненнем крочыць на працу, займацца ў жыцці тым, што падабаецца, — дзеля дабрабыту тых, каго любіш больш за ўсё на свеце.

**Паліна ПРАКАПЕНЯ.**

Нечакана!

# ЯК У ДУШЫ МЕТАЛУРГА... ЗАЦВІЛІ РУЖЫ

**Калі задумацца, якія прафесіі найперш падыходзяць для мужчыны, адразу ў галаву прыходзяць простыя прыклады: сталявар, будаўнік, міліцыянер, урач...**

Але прэч стэрэатыпы! Знаёмцеся: Уладзіслаў САКОВІЧ, металург па адукацыі і кветкавод па сваім цяперашнім занятку.

— Як кожны мужчына, я марыў аб адпаведнай «мужнай» прафесіі. — Нашу размову жыхар гарпасёлка Акцябрскі Гомельскай вобласці пачаў з прыветлівай усмешкі. — Геаграфічна блізка ад нас знаходзіцца металургічная сталіца — Жлобін. Прыváблівалі і расказы старэйшых, хто працаваў на заводзе: павага і пашана людзям цяжкай вытворчасці была гарантаваная. На сталявара я пайшоў вучыцца ў Жлобінскі металургічны каледж. Праляцелі гады вучобы. Праца непасрэдна на прадпрыемстве мала адпавядала маім рамантычным уяўленням... Трэба было знаходзіцца каля палаючых металаў, а гэта вельмі шумна і шкодна для здароўя. Чорныя, нібы смоль, рукі, непрыемны пах, і так кожны дзень...

**«Бывае, што просяць дастаўку на чатыры гадзіны раніцы, — раблю. Выязджаю бясплатна, віншую, калі ёсць патрэба, ад гэтага адчуваю асаблівую асалоду».**

— А як закраліся думкі пра кветкі?

— Знаходзячыся дома, хваляваўся, што застаўся без працы. Пачаў разглядаць розныя варыянты самазанятасці. Паступіў у Гомельскі тэхнічны ўніверсітэт імя П. В. Сухога на завочнае аддзяленне. Зноў тэхніка, мужчынская праца, але хацелася чагосьці яшчэ. Мая маці — заўзятая кветачніца. Але адна справа захапляцца вынікамі матулінай справы і зусім іншая — пачынаць самаму. Спачатку я ведаў толькі два віды кветак: ружы і цюльпаны, бо дарыў іх дзяўчатам *(усміхаецца)*. Не было нічога: ні цяпліц, ні халадзільнікаў. Было толькі жаданне працаваць. Пачаў чытаць літаратуру, знаёміцца з рознымі людзьмі, браць у іх урокі па вырошчванні, складанні букетаў. Да таго ж маці заўсёды была побач. Галоўнае, што я першапачаткова засвоіў: у справе з кветкамі ва ўсім павінна быць дакладнасць. Метал не дазваляе з сабой марудзіць — адразу застыне, а кветка — загіне. Яны ж жывыя. Колькі вады наліць, як падрэзаць, як скласці букет у кампазіцыю, каб не завялі, бо не ўсе кветкі могуць сябраваць паміж сабой: пыльца адной расліны апыляе іншую, якой яна не патрэбна, вось і гінуць кветкі. Дарэчы, як і дзяўчына, расліна не з кожным «ужывецца», мае свой характар. Такім чынам, я вырошчваю кветкі на продаж ужо тры гады (а хлопцу ўсяго 24 гады).

Уладзіслаў яшчэ шмат часу падрабязна расказваў пра тэхналогію вырошчвання, пра тое, што варта рабіць з кветкамі, а што не. Я нагадала пра цюльпаны. На Дзень жанчын Уладзіслаў прапанаваў мужчынам для падарункаў каханым незвычайнага колеру фіялетава-ліловыя цюльпаны.

— Так, гэтыя кветкі патрабуюць шмат увагі. Мы бачым, што ў краме іх можна набыць у лютым або сакавіку, але людзі, якія вырошчваюць іх, пачынаюць рыхтавацца ўжо ў чэрвені. Пілавінне, рачны пясок, торф. Усё трэба змяшаць да патрэбнай кандыцыі, высушыць. У верасні цюльпаны трэба астудзіць пры пяці градусах. У гэты перыяд закладваецца энергія і прыгажосць кветкі. Потым — пасадка, укараненне і шмат чаго яшчэ. У лютым кожныя тры гадзіны трэба праццепліваць цяпліцу, і важна, каб не было дыму. Днём ці ноччу ты павінен падкідваць дровы. І так два месяцы. Стомленасць ад такой працы вялікая, але, калі бачыш, што атрымліваецца, а людзі цябе хваляць, маўляў, малады хлопец сам вырошчвае кветкі, гэта стымулюе. Хочацца рабіць яшчэ лепш і больш якасна.

**«Галоўнае, што я першапачаткова засвоіў: у справе з кветкамі ва ўсім павінна быць дакладнасць. Метал не дазваляе з сабой марудзіць — адразу застыне, а кветка — загіне».**

Акцябрскі — невялікі раённы цэнтр з насельніцтвам трошкі больш за сем з паловай тысяч чалавек. З прамысловасці толькі завод абястлушчанага малака. У асноўным усё базіруецца на малым бізнесе. Кветкі прадаваць спрабавалі многія, але пункты тут жа закрываліся. Нешта не атрымлівалася ў прадаўцоў «жывога» тавару...

— Работа з кветкамі патрабуе цярпення і любові. Не прадаваць кветкі патрэбна, а жыць разам з імі, думаць як яны, прыкмячаць іх паводзіны. Іду метадам спроб і памылак, грошай на лекі і прэпараты для сваіх выхаванцаў не шкадую, але ў бацькоў не пазычаю. Шмат часу і сродкаў адводжу метадычнай літаратуры, каб дaведацца сакрэт патрэбнай тэхналогіі, якая падыдзе ў вырошчванні кветак менавіта мне. Быў выпадак, калі шукаў у інтэрнэце прынцып правільнага зрэзу ружы. Гэта толькі на першы погляд здаецца, што ўсё лёгка... Але не, кветку трэба абразаць толькі раніцай. Нямногія ведаюць, што нельга днём паіць кветкі вадой, калі ім вельмі спякотна. Паліваць трэба на ноч. Цікава, што на кожную кветку патрабуецца пэўная колькасць вільгаці. Хтосьці пра гэта не задумваецца, а пасля здзіўляецца, чаму яны хутка вянуць. Каб зрэзаныя кветкі стаялі 10—14 дзён, ім патрэбна свежае паветра, а не сонечнае святло.

Магу сказаць, што вольнага часу ў мяне амаль што няма. Прачынаюся ў пяць-шэсць гадзін — і адразу працаваць. І для мяне мая справа не цяжар. Прызвычаіўся да такога рытму жыцця. Працую сем дзён на тыдзень, магу да кліентаў прыехаць і ноччу, калі спатрэбіцца. Бывае, што просяць дастаўку на чатыры гадзіны раніцы, — раблю. Выязджаю бясплатна, віншую, калі ёсць патрэба, ад гэтага адчуваю асаблівую асалоду.




І сапраўды. Пры размове з кліентамі, якія прыходзілі ў кветачную краму падчас нашай гутаркі, з твару майго суразмоўніка не сыходзіла ўсмешка. Ён на сёння не ўяўляе сабе іншай дзейнасці.

— Работа з кветкамі, як і работа каля станка ці служба ў арміі, навучыла мяне быць пунктуальным. Кветкі не прабачаць табе хаця б гадзіннаю абыякавасць. У цяпліцы кожны дзень праводжу па дзве гадзіны мінімум, каб ні на адну кветачку не напала хвароба.

Кветкі — гэта і музыка, і проза, і паэзія, і само жыццё... Упэўнены, што, калі быць мэтанакіраваным, вынік абавязкова з'явіцца. І не важна, дзе ты вырошчваеш ружы, важна — як!

**Дар'я ШЛАПАКОВА, студэнтка III курса факультэта журналістыкі БДУ.**

Приорбанк RBI Group

## БУХГАЛТЕРСКИЙ БАЛАНС НА 1 ИЮЛЯ 2018 Г.

«Приорбанк» Открытое акционерное общество

*(в тысячах белорусских рублей)*

| № п/п | Наименование статьи | Символ | Пункт примечаний | На 1 июля 2018 года | На 1 января 2018 года |
|---|---|---|---|---|---|
| 1 | 2 | 3 | 4 | 5 | 6 |
| 1 | АКТИВЫ | | | | |
| 2 | Денежные средства | 1101 | | 114 836 | 111 190 |
| 3 | Драгоценные металлы и драгоценные камни | 1102 | | - | - |
| 4 | Средства в Национальном банке | 1103 | | 246 662 | 294 927 |
| 5 | Средства в банках | 1104 | | 548 971 | 451 000 |
| 6 | Ценные бумаги | 1105 | | 399 617 | 215 553 |
| 7 | Кредиты клиентам | 1106 | | 1 962 701 | 1 951 590 |
| 8 | Производные финансовые активы | 1107 | | 5 966 | 321 |
| 9 | Долгосрочные финансовые вложения | 1108 | | 9 978 | 9 207 |
| 10 | Основные средства и нематериальные активы | 1109 | | 170 748 | 175 838 |
| 11 | Доходные вложения в материальные активы | 1110 | | 1 700 | - |
| 12 | Имущество, предназначенное для продажи | 1111 | | 22 090 | 14 486 |
| 13 | Отложенные налоговые активы | 1112 | | - | - |
| 14 | Прочие активы | 1113 | | 32 598 | 40 968 |
| **15** | **ИТОГО активы** | **11** | | **3 515 867** | **3 265 080** |
| 16 | ОБЯЗАТЕЛЬСТВА | | | | |
| 17 | Средства Национального банка | 1201 | | - | - |
| 18 | Средства банков | 1202 | | 160 499 | 322 526 |
| 19 | Средства клиентов | 1203 | | 2 536 029 | 2 285 041 |
| 20 | Ценные бумаги банка | 1204 | | 145 153 | 52 382 |
| 21 | Производные финансовые обязательства | 1205 | | 43 | 16 |
| 22 | Отложенные налоговые обязательства | 1206 | | - | - |
| 23 | Прочие обязательства | 1207 | | 52 599 | 53 512 |
| **24** | **ВСЕГО обязательства** | **120** | | **2 894 323** | **2 713 477** |
| 25 | СОБСТВЕННЫЙ КАПИТАЛ | | | | |
| 26 | Уставный фонд | 1211 | | 86 148 | 86 148 |
| 27 | Эмиссионный доход | 1212 | | - | - |
| 28 | Резервный фонд | 1213 | | 126 738 | 126 738 |
| 29 | Фонды переоценки статей баланса | 1214 | | 89 933 | 91 485 |
| 30 | Накопленная прибыль | 1215 | | 318 725 | 247 232 |
| 31 | ВСЕГО собственный капитал | 121 | | 621 544 | 551 603 |
| **32** | **ИТОГО обязательства и собственный капитал** | **12** | | **3 515 867** | **3 265 080** |

## ОТЧЕТ О ПРИБЫЛЯХ И УБЫТКАХ НА 1 ИЮЛЯ 2018 Г.

«Приорбанк» Открытое акционерное общество

*(в тысячах белорусских рублей)*

| № п/п | Наименование статьи | Символ | Пункт примечаний | На 1 июля 2018 года | На 1 июля 2017 года |
|---|---|---|---|---|---|
| 1 | 2 | 3 | 4 | 5 | 6 |
| 1 | Процентные доходы | 2011 | | 112 907 | 128 503 |
| 2 | Процентные расходы | 2012 | | 25 809 | 20 086 |
| 3 | Чистые процентные доходы | 201 | | 87 098 | 108 417 |
| 4 | Комиссионные доходы | 2021 | | 82 062 | 73 828 |
| 5 | Комиссионные расходы | 2022 | | 37 014 | 17 909 |
| 6 | Чистые комиссионные доходы | 202 | | 45 048 | 55 919 |
| 7 | Чистый доход по операциям с драгоценными металлами и драгоценными камнями | 203 | | - | 37 |
| 8 | Чистый доход по операциям с ценными бумагами | 204 | | (768) | (167) |
| 9 | Чистый доход по операциям с иностранной валютой | 205 | | 20 773 | 20 724 |
| 10 | Чистый доход по операциям с производными финансовыми инструментами | 206 | | 5 818 | (3 463) |
| 11 | Чистые отчисления в резервы | 207 | | (26 327) | (49 253) |
| 12 | Прочие доходы | 208 | | 4 619 | 2 967 |
| 13 | Операционные расходы | 209 | | 88 769 | 89 887 |
| 14 | Прочие расходы | 210 | | 5 522 | 4 573 |
| 15 | Прибыль до налогообложения | 211 | | 94 624 | 139 227 |
| 16 | Расход по налогу на прибыль | 212 | | 24 682 | 26 621 |
| 17 | ПРИБЫЛЬ | **2** | | **69 942** | **112 606** |

Временно и.о. Председателя Правления — В.В. Дедюль

Заместитель главного бухгалтера — С.И. Капцевич

Лицензия на осуществление банковской деятельности НБ РБ № 12 от 06.05.2013 года. УНП 100220190

https://www.priorbank.by/kvartal-nye-otcety

---

ИНКАСС ЭКСПЕРТ

Закрытое акционерное общество
«Небанковская кредитно-финансовая организация
**«ИНКАСС.ЭКСПЕРТ»**

220005, г. Минск, бульвар им. Мулявина, 6, 501,
тел. +375 (17) 359 74 88, факс +375 (17) 316 23 03
inbox.nkfo@incass-expert.by, www.incass-expert.by

## БУХГАЛТЕРСКИЙ БАЛАНС на 1 июля 2018 года

*(в тыс. бел. руб.)*

| № п/п | Наименование статьи | Символ | 01.07.2018 | 01.01.2018 |
|---|---|---|---|---|
| 1 | 2 | 3 | 4 | 5 |
| **1** | **АКТИВЫ** | | | |
| 2 | Денежные средства | 1101 | 60 848 | 60 607 |
| 3 | Драгоценные металлы и драгоценные камни | 1102 | - | - |
| 4 | Средства в Национальном банке | 1103 | 1 | 900 |
| 5 | Средства в банках | 1104 | 7 460 | 12 |
| 6 | Ценные бумаги | 1105 | - | - |
| 7 | Кредиты клиентам | 1106 | - | - |
| 8 | Производные финансовые активы | 1107 | - | - |
| 9 | Долгосрочные финансовые вложения | 1108 | - | - |
| 10 | Основные средства и нематериальные активы | 1109 | 2 518 | 1 864 |
| 11 | Доходные вложения в материальные активы | 1110 | - | - |
| 12 | Имущество, предназначенное для продажи | 1111 | - | - |
| 13 | Отложенные налоговые активы | 1112 | 16 | 23 |
| 14 | Прочие активы | 1113 | 2 935 | 3 201 |
| **15** | **ИТОГО активы** | **11** | **73 778** | **66 607** |
| **16** | **ОБЯЗАТЕЛЬСТВА** | | | |
| 17 | Средства Национального банка | 1201 | - | - |
| 18 | Средства банков | 1202 | 66 110 | 59 686 |
| 19 | Средства клиентов | 1203 | 552 | - |
| 20 | Ценные бумаги банка | 1204 | - | - |
| 21 | Производные финансовые обязательства | 1205 | - | - |
| 22 | Отложенные налоговые обязательства | 1206 | - | - |
| 23 | Прочие обязательства | 1207 | 1 440 | 1 522 |
| 24 | ВСЕГО обязательства | 120 | 68 102 | 61 208 |
| 25 | СОБСТВЕННЫЙ КАПИТАЛ | | | |
| 26 | Уставный фонд | 1211 | 3 711 | 3 711 |
| 27 | Эмиссионный доход | 1212 | - | - |
| 28 | Резервный фонд | 1213 | 192 | 142 |
| 29 | Фонд переоценки статей баланса | 1214 | - | - |
| 30 | Накопленная прибыль | 1215 | 1 773 | 1 546 |
| **31** | **ВСЕГО собственный капитал** | **121** | **5 676** | **5 399** |
| **32** | **ИТОГО обязательства и собственный капитал** | **12** | **73 778** | **66 607** |

## ОТЧЕТ о прибылях и убытках за шесть месяцев, закончившихся 30 июня 2018 года

*(в тыс. бел. руб.)*

| № п/п | Наименование статьи | Символ | 01.07.2018 | 01.07.2017 |
|---|---|---|---|---|
| 1 | 2 | | 3 | 4 |
| 1 | Процентные доходы | 2011 | 53 | 126 |
| 2 | Процентные расходы | 2012 | 3 | - |
| 3 | Чистые процентные доходы | 201 | 50 | 126 |
| 4 | Комиссионные доходы | 2021 | 418 | 171 |
| 5 | Комиссионные расходы | 2022 | 530 | 117 |
| 6 | Чистые комиссионные доходы | 202 | (112) | 54 |
| 7 | Чистый доход по операциям с драгоценными металлами и драгоценными камнями | 203 | - | - |
| 8 | Чистый доход по операциям с ценными бумагами | 204 | - | - |
| 9 | Чистый доход по операциям с иностранной валютой | 205 | (1) | - |
| 10 | Чистый доход по операциям с производными финансовыми инструментами | 206 | - | - |
| 11 | Чистые отчисления в резервы | 207 | 6 | 3 |
| 12 | Прочие доходы | 208 | 13 544 | 11 514 |
| 13 | Операционные расходы | 209 | 12 637 | 11 256 |
| 14 | Прочие расходы | 210 | 207 | 82 |
| 15 | Прибыль (убыток) до налогообложения | 211 | 631 | 353 |
| 16 | Расход по налогу на прибыль | 212 | 355 | 303 |
| 17 | ПРИБЫЛЬ (УБЫТОК) | 2 | 276 | 50 |
| 18 | Сведения о прибыли на одну акцию в рублях | | | |
| 19 | Базовая прибыль на простую акцию | | | |
| 20 | Разводненная прибыль на простую акцию | | | |

**Председатель Правления — Э. Г. Гонтарь**

**Главный бухгалтер — Е. М. Грибанова**

Дата подписания: 07.07.2018

Промежуточная бухгалтерская (финансовая) отчетность на сайте:
www.incass-expert.by/wps/portal/nkfo/company/reports

Промежуточная консолидированная бухгалтерская (финансовая) отчетность на сайте:
www.bps-sberbank.by/page/financial-statements

ЗАО «Небанковская кредитно-финансовая организация «ИНКАСС.ЭКСПЕРТ» зарегистрировано в Национальном банке Республики Беларусь 27.11.2015 г., регистрационный номер 707. УНП 807000255.

---

## Могилевский филиал РУП «Институт недвижимости и оценки» сообщает о проведении повторных торгов в виде открытого аукциона по продаже недвижимого имущества, по поручению Управления по Могилевской области и Бобруйского межрайонного отдела Департамента по гуманитарной деятельности Управления делами Президента Республики Беларусь

ЛОТ № 1. **31/100 доли капитального строения с инв. № 710/С-1389 – жилой дом 23, адрес: Могилевская обл., г. Бобруйск, пер. Декабристов, 23.** Начальная цена продажи – 17 798,40 бел. руб. Сумма задатка – 1 779,84 бел. руб.

ЛОТ № 2. **Капитальное строение с инв. № 710/С – 22909 – Гараж 434**, адрес: Могилевская обл, г. Бобруйск, ГСК-12, гараж 434. Начальная цена продажи – 3 640,00 бел. руб. Сумма задатка – 364,00 бел. руб.

ЛОТ № 3. **Изолированное помещение с инв. № 700/D-89921– встроенное помещение**, адрес: Могилевская обл, г. Могилев, ул. Болдина, 11. Начальная цена продажи – 73535,04 бел. руб. Сумма задатка – 7 353,50 бел. руб.

ЛОТ № 4. **Капитальное строение с инв. № 720/С-14815 – садовый домик**, адрес: Могилевская обл., Горецкий р-н, г. Горки, с/т «Садовод», участок № 1205. Начальная цена продажи – 317,13 бел. руб. Сумма задатка – 31,71 бел. руб.

| | |
|---|---|
| **Расчетный счет для перечисления задатка** | Получатель платежа – РУП «Институт недвижимости и оценки», УНП 190055182, номер счета в формате IBAN BY21BPSB30121543370109330000, BIC банка BPSBBY2X |
| **Дата, время и место проведения аукциона** | **Аукцион проводится 3 августа 2018 года в 12.00** по адресу: г. Могилев, ул. Первомайская, 77, к. 352, офис Могилевского филиала РУП «Институт недвижимости и оценки». Последний день подачи заявок и внесения задатка: 2 августа 2018 года до 15.00 |
| **Срок и условия оплаты приобретенного с аукциона имущества** | В течение 20 (двадцати) рабочих дней с момента подписания протокола аукциона на расчетный счет Организатора аукциона |

Информация о предыдущих аукционах была опубликована в номерах газеты «Звязда» от 07.10.2017 и 06.04.2018 (лот № 1), 17.05.2017, 25.07.2017 и 06.04.2018 (лот № 2), 19.07.2017, 27.09.2017 и 06.04.2018 (лот № 3), 11.10.2016, 09.12.2016, 07.02.2017, 01.04.2017 и 06.04.2018 (лот № 4)

**Дополнительную информацию можно получить по тел.: +375 222 72-41-14, +375 29 624-26-25, +375 44 738-18-99**

---

## ИЗВЕЩЕНИЕ О ПРОВЕДЕНИИ ПОВТОРНОГО АУКЦИОНА ПО ПРОДАЖЕ ИМУЩЕСТВА ОАО «ЧАЙКА» г. ГРОДНО

| | |
|---|---|
| | **Лот № 1** |
| Предмет торгов, краткая характеристика | **Капитальное строение инв. № 400/С-101260** (мастерская) общей площадью 29,2 кв.м, кирпичное, 1984 г. п., составные части и принадлежности: навес; **капитальное строение инв. № 400/С-101261** (бензохранилище) общей площадью 13,7 кв. м, бетон, 1961 г. п.; **капитальное строение инв. № 400/С-101243** (склад с гаражом и мастерской) общей площадью 1118,4 кв. м, кирпичное, 1961 г. п., составные части и принадлежности: три пристройки, навес; **капитальное строение инв. № 400/С-101037** (здание гаражей с сауной) общей площадью 317,1 кв. м, кирпичное, 1961 г. п., составные части и принадлежности: пристройка, асфальтобетонное покрытие, ограждение металлическое, ворота, калитка, канализационная сеть, водопроводная сеть; **многолетние насаждения** (4 шт.) |

Местонахождение имущества: Гродненская обл., г. Гродно, ул. Титова, 24

**Информация о земельном участке:**
кадастровый номер 440100000001000464, площадь – 0,3250 га, целевое назначение – эксплуатация и обслуживание здания автогаража*
*площадка по адресу ул. Титова, 24 в г. Гродно будет включена в состав функциональной зоны «О1см-п» – общественная смешанная пространственно городского ядра и центра. Возможна реконструкция под объект общественной полифункциональной застройки. Так же необходимо предусмотреть организацию автомобильной парковки для указанного объекта по нормативным требованиям таблицы В.1 Приложения В ТКП 45-3.01-116-2008 «Градостроительство. Населенные пункты. Нормы планировки и застройки»

| | | | |
|---|---|---|---|
| Начальная цена | **268 132 руб. 80 коп. с учетом НДС** | Задаток (3 %) | **8 044 руб.** |
| Сведения о продавце | ОАО «Чайка», г. Гродно, ул. Зернова, 6, тел. 8 (0152) 74 55 02 | | |
| Сведения об организаторе торгов и номер счета для перечисления задатка | Гродненское областное учреждение финансовой поддержки предпринимателей, г. Гродно, ул. Мицкевича, 8, тел. 8(0152) 74 49 11, номер счета BY65BLBB30150500481906001002 в Дирекции ОАО «Белинвестбанк» по Гродненской обл., г. Гродно, ул. Мицкевича, 3, код BLBBBY2X, УНП 500481906 | | |

Срок заключения договора купли-продажи: в течение 20 дней после проведения торгов. Условия оплаты: по договоренности сторон

**Торги состоятся 30 июля 2018 года в 12.00 по адресу: г. Гродно, ул. Мицкевича, 8**

| | |
|---|---|
| Срок подачи документов | **По 24 июля 2018 года включительно до 16.00 по адресу: г. Гродно, ул. Мицкевича, 8** |

**Условия участия и порядок проведения аукциона размещены на сайте организатора торгов www.fincentr.by**

Телефоны в г. Гродно: 8 (0152) 74 49 11, 77 23 79.
Предыдущие публикации: газета «Звязда» от 21.02.2018 г., 19.06.2018 г.

---

## Управления принудительного исполнения главного управления юстиции Витебского облисполкома объявляет о проведении торгов по продаже имущества, принадлежащего ОАО «Иванский-Агро» (УНП 300016117)

| | |
|---|---|
| Наименование (описание) имущества и его стоимость | Лот № 1. Капитальное строение – здание специализированное животноводства, наименование – животноводческая ферма общей площадью 1 777,0 кв. м, инв. № 235С/-7769 с начальной ценой 33 840,00 руб.<br>Лот № 2. Трактор Беларус 82.1, 2007 года выпуска, рег. знак ВА-2 5266 с начальной ценой 4 640,00 руб. |
| Наличие обременений | Отсутствуют |
| Местонахождение имущества | Лот № 1 – Витебская область, Чашникский район, д. Подрезы, 34А.<br>Лот № 2 – Витебская область, Чашникский район, аг. Иванск, ул. Центральная, 4 |
| Место, дата и время проведения торгов | 08.08.2018 г. в 10.00, г. Витебск, ул. Б. Хмельницкого, 10/1, каб. 2.6 |
| Справочная информация об организаторе торгов | Управление принудительного исполнения ГУЮ Витоблисполкома (г. Витебск, ул. Б. Хмельницкого, 10/1, www.vitebskjust.gov.by).<br>Заместитель начальника отдела принудительного исполнения управления принудительного исполнения главного управления юстиции Витебского облисполкома – Рязяпов Никита Фанилевич, тел./факс: (80212) 614012, (8033) 6879170 |
